
Кафля з Орлі ☞ 3

# Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl

№ 6 (2543) Год L Беласток, 6 лютага 2005 г. Цана 2,00 зл.

МАЛАНКА ☞ 8



*Н. Герасімюк: Тыя вучні, якія сёлета не прыбылі на ёлку ў музей, зайздросяць сваім сябрам, што вучацца беларускай мове...*

# Ёлка па-беларуску

Школьнікі, якія вучацца беларускай мове ў падставовых школах Гайнаўскага павета з 17 па 21 студзеня гулялі на ёлках арганізаваных у Музеі і асяродку беларускай культуры ў Гайнаўцы. Бібліятэкар Наталля Герасімюк разам з гайнаўскімі гімназістамі падрыхтавалі дзеткам многа гульняў. Дзед Мароз уручыў для амаль 600 вучняў падарункі. Усё мерапрыемства вялося на беларускай мове.

Гімназісты патрапілі зацікавіць дзетак гульнямі. Заахвочвалі вучняў выказвацца на беларускай мове. Дзеткі ў напружанні чакалі чарговых вершыкаў, песень, загадак і набліжаных да спартыўных спаборніцтваў. Гульні з’ядналі вучняў розных школ.

— Добра, што беларускае мерапрыемства ладзіцца ў святочны перыяд. Мы са школ у Чыжах і Кленіках прывезлі ў музей пад 90 дзетак. Былі яшчэ ахвотныя прыехаць на гульні, але ім не хапіла месца ў аўтобусах, — кажа настаўніца Анна Лаеўская. — Дзеткі задаволеныя конкурсамі, цешацца, што прыбылі на беларускую ёлку.

Наймалодшыя дзеткі гаўкаюць, мяўкаюць, кукарэкаюць і лічаць па-беларуску. Старэйшыя вучні расказваюць пра сябе, спяваюць песні, дэкламуюць вершыкі і рашаюць загадкі.



Дзеткі былі рады ласункам



Ёлку вялі гайнаўскія гімназісты

— Нам вельмі падабаецца арганізацыя мерапрыемства. Дзеткі задаволеныя конкурсамі і ўзнагародамі. Можа пасля ёлкі дзеткі набяруць яшчэ большай ахвоты да вучобы беларускай мовы, — гаворыць настаўніца Аліна Новік.

— Дзеткі маюць нагоду пазнаёміцца з сябрамі з іншых школ і замацаваць беларускую лексіку. Важна, каб вучні зразумелі, што літаратурнай беларускай мовай можна карыстацца ў размовах з іншымі дзяцьмі, — заяўляе настаўніца Валянціна Андрасюк.

Дзеткі збіраюцца да конкурсаў, якія патрабуюць спрыту. Вучні нагогул любяць спаборнічаць, а да змаганняў прыцягваюць яшчэ ўзнагароды.

— Мы любім рабіць фігуры і рашаць загадкі. Умеем таксама заспяваць па-беларуску. На ўроках беларускай мовы многа чытаем і спяваем, — заяўляюць гайнаўскія вучаніцы Паўліна Лапінская, Эвеліна Назарук і Юстына Тамашук.

— Найбольш нам падабаюцца конкурсы з шарамі, — гавораць Міхаліна і Паўліна Герасімюк (вучні мусілі раздушыць шары і пасля выконвалі задачы па картачках, якія знаходзіліся ў шарыках).

— Мне падабаюцца вершыкі і песні ў выкананні вучняў, — заяўляе Паўліна Мічэйка. Яе сяброўка Уршуля Назарук любіць загадкі. Для Аляксандры Лемеш радасцю гульні.

Пасля конкурсаў вучні цесняцца каля Дзеда Мароза, які прынёс смачныя падарункі. Аднак дзеткі перад атрыманнем падарунка мусяць паказаць, што ведаюць беларускую мову. Гавораць Дзеду Марозу вершыкі і спяваюць песні. Ёлка адбываецца пасля Ражджства Хрыстовага і таму некаторыя вучні спяваюць калядкі.

— Мы радуемся, што можам дапамагчы ў правядзенні ёлкі і спрычыніцца да добрай гульні, — кажуць гімназісткі Анна Дудзіч, Наталля Вашчук і Кацярына Федарчук, якія вялі з іншымі сябрамі конкурсную частку і якраз адпачываюць.



Наталля Герасімюк

— Тыя вучні, якія сёлета не прыбылі на ёлку ў музей, зайздросяць сваім сябрам, што вучацца беларускай мове. Напэўна ў наступным годзе будзе больш ахвотных вывучаць родную мову. Тады будуць яны маглі таксама прыбыць у наш музей на ялінку, — заяўляе ў канцы мерапрыемства галоўны арганізатар Наталля Герасімюк.

**Аляксей Мароз**

## Дзікі промах ☞ 2

Аляксандр Вярбіцкі

*Шчырая праўда, што назва Скярневіцы ў ніякія вароты не лезе, бо выдадзены ў Мінску новенькі польска-беларускі слоўнік падае Скернявіцы. Тытульныя моваазнаўцы на шыльдзе новенькага Консульства РБ памесцілі яго „ў Бяла-Падлясцы”; калі б бліжэй нас — было б „у Бельск-Падлясках”...*

## Калядаванне ☞ 5

Міхась Хмялеўскі

*Сапраўднымі вясковымі калядкікамі прадставіліся „Чыжавяне” з Чыжоў, што ў Гайнаўскім павеце. З прыгожай гвяздай, з музыкантам, мужчыны ў кажухах, жанчыны ў цёплых хустках на галовах ды шырокіх спадніцах у палоскі, энергічна прэзентаваліся з каляднай песняй на сцэне...*

## Ліра і лірнікі ☞ 8

Ганна Кандрацюк

*Лірнік Алесь Лось (ён жа дудар, скрыпач, бубнач, гітарыст, спявак, майстар этнічнага танца, графік, іканапісец), быццам св. Міхаіл з названага твора, абуджае дух мінулага. Ён выводзіць на святло прызабыты лірніцкі жанр і выканаўцаў...*

## Што з мовай ☞ 9

Уладзімір Хільмановіч

*Татальная русіфікацыя навучальных устаноў не проста змяняе мову зносін. У дзяцей скрадаюць родную мову як светаглядную духовую каштоўнасць. Гуманней вырваць чалавеку язык, чым пазбавіць яго роднай мовы, бо на чужой мове немагчыма выхаваць псіхічна паўнавартаснага чалавека...*

## Запіскі кантрабандыста ☞ 10

Сымон Нальшанскі

*Перада мной вакол машыны танцаваў Косцік Крыванос. Ведаў я яго даўно. З таго дня як яго выгналі з міліцыі (з яго слоў за чэснасць), і ён пастанавіў займацца кантрабандай. Гэта быў вельмі вынаходлівы і вельмі эмацыйны хлопец. Усе яго прыдумкі як лепш схаваць кантрабанду суправаджаліся такім выбухам эмоцый, што, здавалася, ён атрымаў стопрацэнтныя гарантыі жыць дзвесце трыццаць два гады і сем месяцаў...*

## Якія назвы ☞ 11

Дарафей Фіёнік

*Поўнасцю згаджаюся з думкай, што ў нашых умовах запісванне назваў мясцовасцяў павінна быць згоднае з арыгінальнай вымовай. Гэта тычыцца перш за ўсё тэрыторый Бельскага, Гайнаўскага і Сямятыцкага паветаў, дзе мова беларусаў у агульнасці іншая, чым тых з Беластоцкага ці Сакольскага...*

# „Карчма” і выбары



*...Дзень выдаўся няўдалы. Усё больш астатнім часам стамляе страх. Не свой — чужы. Няма нічога больш агіднага, чым здаровыя мужыкі, якія літаральна трасуцца за свае, ужо зусім і не цёплыя, пасады. Студэнты баяцца, пенсіянеры, якія пражылі амаль усё жыццё, баяцца, „інтэлігенты” баяцца, „пралетарыі” баяцца. Чаго? Гутарка не пра мужчынскі дух часоў Якуба Ясінскага ці Людвіка Нарбута. Гутарка пра элементарныя правы годнасці і гонару. „Бацька” (правільней было б казаць „айчым”) крычыць на міністраў, тыя на падначаленых, тыя яшчэ на ніжэйшы ровень. І так з Мінска да правінцыі. І кожны трасецца за свой азадак, гатовы „здаць” усё і ўсіх.*

*Ёсць яшчэ група „радыкальных апазіцыянераў”, якія цудоўна спалучаюць сваю нібыта палітычную дзейнасць з кар’ерным ростам па службовай лесвіцы. Здаецца, добра вядома, што ўсіх сапраўды апазіцыянераў даўно пазвальнялі з дзяржаўнай працы. Але знаходзяцца і такія, што вераць імітатарам і крывадушнікам. Як кажуць у народзе, не ўсіх дурных вайна пабіла...*

*... Дзяўчаты — гэта адзінае, што цешыць вока на вуліцы, сапсаванай чужынскімі надпісамі і шыльдамі. Вабных дзяўчын так шмат, што надыходзіць прыкрае шкадаванне — ім бедным папросту няма за каго выходзіць замуж. „Трэцяе пакаленне” (гутарка ўжо пра хлопцаў) характарызуе нейкі інфантылізм — на гітарах не граюць, спортам не займаюцца, дзяўчатамі нібыта хочуць, але не могуць...*

*... Па дарозе дамоў зайшоў я ў новую кавярню „Карчма”, што на самым рагу вуліцы Ажэшкі. Колішняя кавярня-„забягалаўка” зараз выдае на шыкоўны густоўны рэстаран, стылізаваны пад сярэднявечча. Раней такія даводзілася бачыць хіба ў Празе ці Кракаве.*

*Вольных месцаў амаль не было і афіцыянт запрапанаваў падсесці за столік, дзе ўжо сядзела парачка...*

*... А выбарчую сістэму трэба мяняць. Прыкладам, адна сям’я — адзін голас. А можа па колькасці чалавек у сям’і? Учора размаўлялі на тэму ці варта на выбарах даваць жанчынам права голасу. Швейцарцы ў Еўропе зрабілі гэта найпазней, здаецца гэтая краіна жыве і развіваецца ці не найлепш. Не сакрэт, што жанчыны заўсёды кіруюцца не розумам, а эмоцыямі. Галасуюць зазвычай выключна паводле знешніх сімпатый і з гледжання маладосці кандыдата. У беларусаў галавой сям’і найчасцей ёсць жанчына, у 1994 годзе гэта стала адным з найважнейшых фактараў...*

*... За столікам адразу агарнула пачуццё няёмкасці. Мужчына і жанчына, абое гадоў крыху за сорак (найверагодней старыя сябры-каханкі, якія не бачыліся колькі гадоў), відавочна хацелі пабыць адны, прысутнасць староннягa з боку не магла не замінаць. Але нешта не дазволіла мне сысці адразу. Замовіў салатку „Хутарок”, яшчэ нейкую страву з блінцамі (дзяцінства на беларускіх вясковых хутарах у мяне заўсёды выклікае значную семантычна-асацыятыўную сентыментальнасць) і папрасіў афіцыянта выканаць заказ як найхутчэй...*

*... Так званая беларуская аб’ яднаная апазіцыя падобна звар’яцела канчаткова. Цэлы месяц спрэчкі ідуць пра Гродзенскую цэнтральную выбарчую акругу. У ёй, адзінай у Беларусі, як вядома, не быў абраны дэпутат „палаткі”. І вось зараз узняты вэрхал па пытанні каму па ёй балатавацца ад апазіцыі. Спрачаюцца, камбінуюць, вядуць перамовы, склікаюць з’езды, цэнтральныя рады. Ад усяго гэтага адчуванне нейкай безнадзейнай абсурднасці. Давайце зірнем з гледзішча логікі звычайнага разумнага чалавека. На псеўдавыбарах у кішэнны Вярхоўны Савет не прапусцілі аніводнага кандыдата не ад улады. Чаго туды па гэтай няшчаснай акрузе пішчом лезці апазіцыі? Папрацаваць з выбаршчыкамі па адной акрузе краіны, ці „пракруціць” нейкія грошы, ці задаволіць свае амбіцыі? У любым разе выдае на прымітыўнасць светагляду ў разуменні сітуацыі...*

*... Міжволі мусіў я слухаць размову парачкі. Усё было ладна, пакуль мужчына, па выглядзе выканкамаўскі работнік, на сваё асабістае няшчасце не загаварыў пра рэферэндум і выбары. Яго катэгарычнае сцвярджэнне пра падтрымку „правильной политики” літаральна страсянула прыгожую суразмоўцу. Жанчына парывалася сысці і яе стрымала хіба толькі прысутнасць незнаёмага чалавека паблізу. Але як мужчына „выканкамавец” у яе вачах быў скончаны. Разлічыўшыся, хуценька сышоў я з думкаю, што ў новым выбарчым заканадаўстве ўсё ж варта пакінуць жанчынам права голасу...*

**Уладзімір Хільмановіч**

# Дзікі промах караля Стаха



*Васіль Сакоўскі ў 4-м нумары „Нівы” („Не па-нашаму”) стаўляе яе публіцыстаў у куток, каленьмі на гарох і грэчку, за нядбайныя адносіны да нашай спадчыны. Я дазволю сабе падняць два пальцы і крыху развесці тары-бары.*

*Шчырая праўда, што назва Скярнявіцы ў ніякія вароты не лезе, бо выдадзены ў Мінску новенькі польска-беларускі слоўнік падае Скернявіцы. Тытульныя мовазнаўцы на шыльдзе новенькага Консульства РБ памясцілі яго „ў Бяла-Падлясцы”; калі б бліжэй нас — было б „у Бельск-Падляскіх”. Вяртаючыся ў тутэйшыя вароты: я нейкі час намагаўся называць адну падбельскую вёску Ягуштовам, але нядаўна даведаўся, што тамашні народ (пра насельніцтва неяк непрыстойна пісаць) патрабуе называць сваю мясцовасць Аўгустовам. І я лічу гэта цалкам апраўданым патрабаваннем, бо ж „августейших” цароў цяпер няма, толькі дэмакратыя, а ў дэмакратыі „августейший” акурат „demos” — народ.*

*Слова „augustus” (вялікі, свяшчэнны, знатны) лацінскага паходжання. Паводле гісторыкаў-вялікалітвіністаў, у XVI стагоддзі нашы эліты, эліты Вялікага княства Літоўскага, уступілі ў працэс самапаланізацыі, прымаючы польскую мадэль шляхецкай культуры і засвойваючы неабходны мінімум еўрапейскай (лацінскай) цывілізацыі. А ў пачатку XIX стагоддзя, ужо пад маскоўскім панаваннем, гэты працэс парадаксальна ўзмацніўся. У той час польская мова стала набываць больш шырокае распаўсюджанне і ўсё культурнае і ліберальнае пацягнулася да Польшчы. Мова тут, вядома, не пра наш просты народ.*

*Вялікая французская рэвалюцыя вынесла на сцэну і просты народ, якім зацікавіліся не толькі Ян Чачот з Карлам Марксам, але і „августейший” імператар Аляксандр ІІ, адмяніўшы прыгонные права. У апошнім выпадку мелася на ўвазе прыцягненне на свой бок падбухторванага рэвалюцыянерамі найбольш тлумнага грамадскага класа. Перамогу ў гэтым змаганні атрымалі бальшавікі, якія найбольш заядла атакавалі праціўніка, найбольш нацкоўвалі тлум. Гэты паспяховы метад прыцягнення народных мас мы сёння маем ўвачавідкі перад сабой, у нашай „Августейшей” (Найяснейшай) дэмакратыі, якая ў плане эвалюцыйнай тэорыі Дарвіна яшчэ не паднялася на дзве нагі. Пра Беларусь шкада нават праліваць атрамант.*

*Вёска, наша вёска! Колькі нашанскія эліты пралілі светлых фарбаў каб абвесці яе „августейшим” арэолам захавальніка спадчыны. Але калі б тры апошнія „августейшие” польскія каралі-Аўгусты не чакалі французскай рэвалюцыі і рамантызму, толькі шляхам нейкіх прываб спрабавалі прыцягнуць, следам за элітамі, і простанароддзе ў больш шырокія цывілізацыйныя вароты! Хто ведае, ці калі б гэта былося ім, Аўгустам, удалося, ці яно, наша вяскоўства, следам за дваранствам, не самапаланізавалася б — і сёння ад мора да мора не прасціралася б унітарная моўная і культурная прастора з новенькай, як амерыканская, спадчынай. І не было б архаічных „деревенщинных” беларусаў, і не было б ніякіх з імі клопатаў. Не прымяркоўвалі б яны заканатворчай паэзіі да прозы жыцця, не дурылі б галавы нейкай там анамастыкай. То ж менавіта з-за гэтай абузы, з-за гэтай скулы сёння па абодвух баках Свіслачы і Буга шчыруюць разлютаваныя аблавы з прапагандыстаў, юрыстаў, сілавікоў. Ленін вечна жывы і цкаванне вырасла ў ранг заяўкі пра існаванне, самапрэзентацыі. Перад намі разгортваецца бессаромны спектакль тыпу Big Brother. Пра райскі фігавы лісток мала хто, бадай, асмельваецца і згадваць.*

*Хаця закіды, пастаўленыя нам масцітым фельетаністам, не менш сур’ёзныя за пастаўленыя надоечы згаданымі органамі, усё ж лічу, што павінны яны быць перанакіраваны ў адрас нашага „тутэйшага” караля Стаха; саксонцамі няхай займаюцца саксонцы. Бо калі б не ягоная сацыялагічная блізарукасць, не было б у нас ні рэвалюцый, ні дзікіх паляванняў. Быў бы рай.*

*А Скерневіцы павінны правапісацца так, як і нагавіцы. Адтуль жа стартаваў у найяснейшыя вярхі (не без падтрымкі нашага народу) слаўны кандыдат у сапраўдных носьбітаў нагавіц. Ён жа, фінішуючы як сапраўдны мужчына, заклікаў тутэйшы электарат выбраць у еўравярхі героя відовішча Big Brother. Каб хаця так выправіць найяснейшага караля Стаха неахайнасць. Каб і тутэйшыя пабачылі крыху свету.*

**Аляксандр Вярбіцкі**

**Вачыма еўрапейца**

# Вяртанне кашмару



*Мінула 60 гадавіна вызвалення аднаго з найстрашнейшых месцаў, якія стварыў чалавек — канцэнтрацыйнага лагера Аўшвіц-Біркенаў. Пры нагодзе аказалася, што памяць шмат каго з палітыкаў-еўрапейцаў вельмі кароткая. У рэзалюцыі, падрыхтаванай у Еўрапарламенце забылі былі аб ахвярах, якія паходзілі з Расіі, а палякі апынуліся за гомасексуалістамі. На канец, аднак, еўрадэпутаты паразумеліся і выправілі нетактоўнасці, падкрэсліваючы, дарэчы, што катам была фашысцкая Нямеччына. Іншыя нетактоўныя рэакцыі апублікавалі некаторыя газеты, упарта падкрэсліваючы назву „польскія канцлагеры”. Быццам і гэтага было мала, перад гадавінай свет абляцеў здымак брытанскага прынца Гары, пераапранутага на гулянцы ў фашыстоўскую форму. У якасці пакарання каралеўская сям’я загадала свайму маладому парастку наведаць якраз Аўшвіц.*

*У час святкавання гадавіны хтосьці з саноўнікаў сцвердзіў, што калі чалавек чалавеку наладзіў хоць бы раз такі кашмар, то можа ён паўтарыцца, паколькі па сваёй натуры чалавек у змозе гэта зрабіць. Цяжка з гэтым не пагадзіцца, назіраючы асабліва адраджэнне нацысцкіх рухаў не толькі ў Нямеччыне. З жахам чытаў я справаздачы ў мясцовым друку аб сустрэчы больш за 200 брытагаловых маладых людзей, якія гулялі, карыстаючыся гітлераўскімі жэстамі і падспяваючы нацысцкія песні. Не праводзілася гэта ў Мюнхене ці Дрэздэне, але ў гатэлі „Лясны” ў Чорнай-Беластоцкай. Аб „імпрэзы” з гонарам паведамлялі на інтэрнэт-старонках самі завадатары з арганізацыі „Гонар і кроў”, якая, без сумнення, услаўляе неанацысцкія лозунгі і сімвалы. Гэтая арганізацыя, між іншым, услаўляе хворую ідэю аб тым, што галакост гэта толькі міф, а адзіная раса гэта белая раса і г.д. Дарэчы, звязаная яна з іншай фармацыяй, якая дзейнічае на тэрыторыі Польшчы: „Combat 18”. Адзін і восем гэта лічбы, якія адпавядаюць літарам у алфавіце: А і Г, як Адольф Гітлер. У Чорнай-Беластоцкай падыгрывала ім між іншым група з Беларусі „Молот”. Як інфармавала мінская „Комсомольская правда в Белоруссии”, паходзіць яна з Оршы і раней называлася „Пракс’я”. Гучала не толькі ў іх выкананні музыка да песень са значнымі загалоўкамі: „Арыйскі вяяр”, „Белы рок”, „Армія свастыкі”, „Гэй, жыд”.*

*Чаму да гэтай „падзеі” дайшло якраз на Падляшшы, у адной з найдалей адсунутых на ўсход ад Еўрасаюза мясцін? Уласнік гасцініцы „Лясны” Яраслаў Дзем’ян вось як тлумачыўся:*

*— Гэта не быў канцэрт. Проста, нейкія людзі, сужонства, нанялі ў мяне памяшканне. Не пытаўся я, адкуль родам ён, а яна ці праваслаўная, ці ў яе нейкія іншыя погляды. Хтосьці здымае памяшканне, плаціць мне за гэта, ну і ўсё.*

*Згадзіцеся, нейкія дзіўныя гэтыя тлумачэнні, асабліва тыя, што датычаць праваслаўных поглядаў! Пакуль што, пракуратура думае, ці ўзбуджаць крымінальную справу па гэтай прычыне, хоць да гэтага забавязвае яе 13 артыкул Канстытуцыі разам з 256 артыкулам Крымінальнага кодэксу. Пракуратура задумоўваецца, а тым часам, калі стала гучна аб „імпрэзе” ў „Лясным”, з інтэрнэт-старонак „Гонару і крыві” паспелі знікнуць здымкі, якія дакументуюць забароненыя жэсты і сімвалы. Відавочны доказ паспеў уцячы пракуратуры з-пад носа.*

*„Забава” ў „Лясным”, кароткая памяць еўрадэпутатаў ці „гулі” прынца Гары — відавочныя доказы таго, што аб кашмары Аўшвіц-Біркенаў трэба безупынна прыпамінаць, і не толькі пры нагодзе круглых гадавін.*

**Мацей Халадоўскі**

# Кафля з Орлі была добрай

**Гарадское права Орля атрымала ў 1634 годзе — яна на 115 гадоў старэйшая за Беласток. Сёння пасля колішняй пышнасці асталіся ў Орлі толькі ўспаміны.**

**Яшчэ ў перыяд ПНР Орля лічылася прамысловай вёскай. Яе жыхары працавалі на месцы, у некалькіх дзяржаўных фірмах, найбольшай з якіх была кафлярня, з якой стагоддзямі выпускалася высакаякасная кафля.**

**Сёння ў Орлі пражывае менш за тысячу жыхароў. Толькі асфальтавыя дарогі, новая школа і водаправод з'яўляюцца сведчаннем прысутнасці ў ёй дваццатага стагоддзя. Новых заводаў ніхто не ўзводзіць, зараслі мохам і кустамі падмуркі пад новы асяродак здароўя, а кафлярню закрылі ўжо дзесяць гадоў таму. Нягледзячы на багатыя навакольныя радовішчы высакаякаснай гліны, упалі, на жаль, планы пабудовы тут керамічнага завода.**



*Персанал арлянскай кафлярні ў 1949 годзе*



Фота МІХАЛА МІНЦЭВІЧА

*Сяргей Нядзельскі (2000 год)*

У Орлі занятак кафельшчыка часта пераходзіў з бацькі на сына. Сяргей Нядзельскі прапрацаваў пры кафлі амаль пяцьдзесят гадоў. Вось як некалькі гадоў таму, яшчэ пры жыцці, у 82-гадовым узросце ўспамінаў ён гэтую працу.

— У Орлі пры санацыі былі тры кафлярні, якія працавалі поўным ходам. Іх уладальнікам была яўрэйская сям'я братоў Войштынаў: Срулька, Абрамка, Ёселя і Шмулька; апошні быў шэфам. Іхняй уласнасцю быў таксама завод у Бельску па вуліцы Галавескай і ў тую кафлярню работнікі даязджалі таксама з Орлі. Мой бацька Павел працаваў там з 1921 года. У той час яўрэі прымалі на працу кожнага, хто хацеў. Новыя працаўнікі вучыліся прафесіі кафельшчыка на месцы, ад супрацоўнікаў.

У найбольшай арлянскай кафлярні, што знаходзілася пры выязной дарозе ў Бельск, працавала некалькі соцень работнікаў. Два меншыя заводы былі ў цэнтры мястэчка, у раёне сённяшняй вуліцы Бельскай побач аўтобуснага прыпынку. Сыравіну для вырабу кафлі прывозілі з глінянага кар'ера, што побач сённяшняга пажарнага дэпо.

Гліну мачылі ў басейнах, пасля ачышчалі ад мулу. Механізм для адмульвання прыводзілі ў рух коні. Каля 1960 года адзін кемлівы працаўнік збудаваў прывод ад рухавіка ўнутранага згарання.

Драўніну для печаў, дзе выпальвалі кафлю, зносілі навакольныя жыхары. Яўрэй скупляў усё, што падыходзіла для спальвання. Працаўнікі кафлярні рэзалі і секлі драўніну. У 1960-х гадах была пастаўлена спецыяльная машына для сячэння дроў.

Уладальнік быў багаты, гаспадарны і ашчадны. Калі ён знайшоў на дарозе кавалак гліны, загортваў яго ў чыстую хустачку і заносіў у кафлярню. Два-тры разы ў тыдзень работнікі вазілі на жалезняках гатовую кафлю на чыгуначную станцыю ў Рыгораўцы або Бельск. Войштын задумоўваў пракласці чыгуначны пуць у самую Орлю, але мяшчане не далі на гэта згоды.

Сфармаваныя ўручную кафліны складалі па 8 600 штук у печ, пасля замуроўвалі ўсе праёмы і выпальвалі ў адпаведнай тэмпературы праз 36 гадзін. Пасля гэтага кафлю вымалі, пакрывалі цынкава-свінцовай палівай і паўторна выпальвалі; у кафлярні працавалі чатыры печы.

Уладальнік, Шмулько Войштын, жыў на тэрыторыі фабрыкі ў доме, пабудаваным з разабранай школы ў Кашалях. Меў ён таксама гаспадарку, трымаў коней і кароў, наймаў даглядчыка-садавода, а ўсю нерухомасць пільнавалі сабакі і стораж з рэвальверам. Уладанне ахоплівала некалькі гектараў і распасціралася аж да ракі Арлянкі.

Калі прыйшлі саветы, сям'ю Войштынаў, як адну з багацейшых, вывезлі ў Расію. І як высветлілася, дзякуючы дэпартацыі гэтая арлянская сям'я выжыла. Загадчыкам кафлярні стаў расіянін Лейкін. Ён пабудаваў непадалёку кафлярні, над старым рэчышчам Арлянкі, фінскую лазню, якая ператрывала вайну і служыла ўсім жыхарам Орлі да 1960-х гадоў.

У пачатках нямецкай акупацыі, калі яўрэяў пасялілі ў мясцовае гета, ноччу патаемна прыходзіў да мяне Войштын. Малоў ён у нашых жорнах збожжа на хлеб і часта казаў:

— В жизни всяк случится, и бедный богатому прислужится.

У той час кафлярняй загадваў нямецкі камісар Сандэцкі, а замяж кафлі выпускала яна цэглу і чырвоную чарапіцу.

Пасля вайны кафлярню нацыяналізавалі і разбудавалі.

* * *

Уладзіміру Здановічу сёння 83 гады. З 1939 года працаваў у мясцовай кафлярні: у Войштынаў, пры саветах і на канец у дзяржаўнай фабрыцы пасля вайны. Ён астаўся адным з нямногіх жывучых яшчэ кафельшчыкаў.

— Працаваў я ў кафлярні і недзе каля 1940 года пабудаваў свой горан і стаў дома займацца ганчарствам, — успамінае. Тады ў Орлі было траіх ганчароў: Лявон Русіновіч, Пётр Русіновіч і я. Раней, яшчэ пры санацыі, гэтым рамяством займаўся Якуб Назарэвіч (брат майго дзеда — М.М.). Я выраблюў розную пасуду: міскі, місачкі, збаны, спарышы, вазоны, кубкі. Помню, што ў час вайны нідзе немагчыма было купіць гаршкоў.

Гліну бралі з Бору (лес у Орлі); сёння там гмінная звалка адкідаў. З таго месца бралі таксама гліну для кафлярні. Грузіў я гліну ў драўляную скрыню, мачыў, размешваў. Цераз сіта працэджваў яе ў другую скрынку. Яна тады ачышчалася, а пазнейшы адстой падыходзіў для апрацоўкі на ганчарным крузе, які ў мяне спраўны і да сёння; яму 65 гадоў.

Пасля фармоўкі пасуды на крузе, яе трэба было выпаліць. Аднаразова ў горан змяшчалася каля трохсот такіх місачак, а для аднаго абпальвання трэба было расходаваць каля кубаметра дроў. Спярша выпрабоўвалася печ, пасля ўваход трэба было замураваць і праз дзесяць гадзін пасуда была гатова, значыць, выпалена.



Фота МІХАЛА МІНЦЭВІЧА

*Уладзімір Здановіч за сваім ганчарным кругам (2003 год)*

Мая праца выклікала вялікае зацікаўленне; заглядалі дарослыя і дзеці. Пры немцах я таксама выраблюў гліняную пасуду і да мяне часам прыходзіў намецкі камісар Сандэцкі; аднойчы прыйшоў ён нават з жонкай. Я тады прадаваў міскі па паўмаркі за штуку, а ён мне сказаў:

— To kosztuje roboty i trzeba brać dwie marki.

У 1943 годзе мяне забралі на прымусовыя работы ў Германію, пасля трапіў у савецкую армію, а вярнуцца дадому ўдалося мне толькі ў чэрвені 1946 года.

На жаль, мой горан быў разбіты, але захаваўся ганчарны круг. Зноў пайшоў я працаваць у кафлярню, цяпер ужо дзяржаўную. Дома на крузе фармаваў гліняную пасуду, а выпальваў яе ў кафлярні. Мае вырабы ахвотна куплялі мясцовыя жанчыны, а часам запрагаў каня і вазіў на продаж па навакольных вёсках.

* * *

У 1995 годзе, пасля звыш стогадовага існавання, кафлярня была ліквідавана. Частку абсталявання ўдалося прадаць, частку расцягнулі, а пустыя будынкі некалькі гадоў руйнаваліся. Накане́ц купіў іх Сцяпан Хурса, селянін з Кашалёў. Новы ўладальнік не выраблюе, аднак, кафлі, а старыя будынкі патрабуюць рамонтаў. Кафляныя печы сталі замяняць цэнтральным ацяпленнем, а кухонныя печы — газавымі і электрычнымі печкамі і духоўкамі.

У Орлі, нягледзячы на багатыя навакольныя (з боку Рудутаў) радовішчы высакаякаснай гліны, вытворчасць керамікі спынілася. Патрабаваная арлянамі ў пачатку 1980-х гадоў пабудова завода будаўнічай керамікі зацягнулася ў віне планавікоў са сталічнага „Cerprojektu”. Яны павінны былі да ліпеня 1984 года апрацаваць праграмную канцэпцыю, але па сённяшні дзень гэтага не зрабілі. Тадышні міністр будаўніцтва Кукурыка асігнаваў Орлі крэдыт, але з-за марудпасці праектантаў абяцаныя грошы трапілі ў іншае месца. А шкада, бо планаваны на 1989 год запуск вытворчасці чырвонай цэглы мог бы актывізаваць арлянскую кераміку і — што сёння вельмі важнае — даць многім працу і павысіць узровень жыцця арлян.

У 1992 годзе была праведзена геалагічная разведка Арлянскай гміны, у выніку якой зафіксавана радовішча гліны аб'ёмам у 2 253 тысячы кубаметраў, прыгоднай для пустацелых цэглаў, дрэнажных трубак і кафлі.

У сакавіку 1992 года многіх жыхароў Орлі ўзбударажыла рашэнне тадышніх гмінных улад, якія беластоцкаму прадпрымальніку прадалі 2,5-гектарны ўчастак з залежамі гліны і артэзіянскай студняй. Гміна прадала палетак, на якім мела стаяць планаваная фабрыка, і студню, якая прадбачвалася запаснай крыніцай вады для мястэчка. Новы ўладальнік, які, мабыць, унюхаў сабе інтарэс ад будовы фабрыкі, нічога на ўчастку не робіць; у гміне нельга даведацца, ці плаціць ён падаткі. Вядома толькі, што саракагектарнае радовішча надалей застаецца дзяржаўнай уласнасцю (апрача згаданых 2,5 гектараў).

Залежы гліны спакойна чакаюць лепшага часу. Калі нашы „Зялёныя лёгкія Польшчы” не зарастуць пушчай, тады прыродным нашым багаццем мо пакарыстаюцца будучыя пакаленні.

**Міхал Мінцэвіч**

# Космас Віктара Кабаца



Не з мусу, але з выбару — маючы выгадную кватэру ў жылым корпусе — пасяліўся ў зямлянцы гайнаўскі мастак Віктар Кабац. Спіць, есць, працуе амаль два метры пад зямлёй усярэдзіне Белавежскай пушчы. Спытаў я яго, як да гэтага дайшло.

— Семяноўка, гэта мой такі прыватны прытулак, — кажа мастак. — Пятнаццаць гадоў таму купіў там кавалачак зямлі ў бок Баб'яй Гары, каля чатырохсот метраў ад Семяноўскага вадаёма. Там растуць прыватныя лясы. У Семяноўцы, так як і на ўсёй Усходняй сцяне, землі пясочныя, V-VI класаў, і людзі кінулі іх абрабляць. Вырас там самасейны лес, якому цяпер 30-40 гадоў. І там мы з жонкай купілі восем араў — амаль за паўлітра. У той час зямля была вельмі танная — афармленне справы ў натарыуса каштавала больш за зямлю.

Чаму пабудаваў зямлянку? Паколькі там была земляробная тэрыторыя, нічога ў тым месцы нельга было будаваць. Згодна закону на сельскагаспадарчых угоддзях можна было паставіць толькі будан для схавання тачкі ці рыдлёўкі. І таму я, каб абысці тыя будаўнічыя параграфы, пабудаваў сабе такую зямлянку, якую не ахоплівалі патрабаванні законаў. Будаўнічага матэрыялу было навокал поўна. На гэтых землях ляжала мноства меншых і большых камянёў. Завёз я туды тачку, грузіў у яе камяні, якія былі мне пад сілу, і з іх пабудаваў палову зямлянкі.

Пачыналася праца з капання зямлі, а паколькі там быў гожанькі пясочак, то капалася лёгка. І той пясок можна было адразу мяшаць з цэментам і мацаваць тыя камяні. Каменная сцяна пачынаецца на паўтараметровай глыбіні вялікімі валунамі знізу, а пасля штораз меншымі. Вышэйшая частка завершана паўкруглымі бярвёнамі. Зямлянка даволі вялікая — 3,5 на 5 метраў, яе дах, пабудаваны са слаёў моху і толі, выступае над зямлю. Столь зроблена з таўсцейшых калкоў, якія гарантуюць стабільнасць. Усярэдзіне ціха, прытульна і цёпла, няма ні следу сырасці, перад якой засцерагае слой сухога моху і толі. Камінчык абаграве цэлае памяшканне. Ёсць у ім ложак, стол, ёсць на што сесці. Зямлянку гэтую будаваў я два-тры гады, крыху дапамагаў мне сын.

Калі памяняўся будаўнічы закон, які дазволіў стаўляць будынкі да дзесяці квадратных метраў, я пакарыстаўся новаўвядзеннем і побач зямлянкі дабудаваў такі будынак са знесенага хлява. У ім шкляны дах, што дае мне добрае асвятленне ў часе працы. Ёсць там кухня і туалет, няма затое тэлевізара і тэлефона. І калі ў мяне выхадныя, тады мы з жонкай едзем у Семяноўку, дзе можам аставацца тыдзень або і месяц. Жонка таксама займаецца мастацтвам, ва ўзросце шасцідзесяці гадоў закончыла іканапісную школу і цяпер піша іконы.

— Ці пражыванне ў зямлянцы спрыяе творчаму ўздыму?

— Вельмі спрыяе, бо нават такі цывілізацыйны антураж, як у Гайнаўцы, перашкаджае мне ў творчых задумах. А ў зямлянцы можна сабе спакойна паразважаць, ёсць час, ёсць магчымасць папрацаваць фізічна, бо такі высілак таксама адсвежвае творчае ўспрыманне свету. Мне семдзесят гадоў, але я пайшоў у пілігрымку з Беластока ў Вільню, дзе за дзень трэба было прайсці па трыццаць кіламетраў. Я магу за дзень праехаць 50-60 кіламетраў на веласіпедзе. Калі ў мяне быў сабачка, то мы разам праходзілі па пушчы па трыццаць кіламетраў і не было гэта ніякім клопатам. У творчасці патрэбнае таксама добрае здароўе, каб было добрае самаадчуванне, каб не стагнаць, бо тады інакш складваецца творчы працэс.

Зямлянку Віктара Кабаца вельмі цяжка знайсці ці нават здагадацца, дзе яна знаходзіцца...

— Не хачу рабіць здымкаў зямлянкі, — кажа ён, — ні паказваць месца, дзе яна збудавана. Бо зараз людзі пачнуць дакучаць, адбіраць спакой. Тут маё такое касмічнае месца. Адным яно ў Белавежы, іншым — над вадаёмам; няхай будзе і так — гэта іх выбар. А мой прытулак, маё сховішча — тут! **(мм)**

# Бахматы

Вадасховішча Бахматы — яно ў нас таямнічае і адзінае. Дае курорт і забаву ды добрую і пачэсную славу. Для гміны гэта нядрэнны даход — а сёння лічыцца кожны грош і злот. І таму Дубіцкая гміна трымаецца, бо войт кемлівы і на справах знаецца. На Бахматах вельмі прыгожа, і кожны сюды прыйсці і прыехаць зможа. І ідуць-едуць са ўсіх старон; можа прыехаць і бедны, і прэзідэнт, і барон. Стаяць домікі летнія: прыгожыя, не вельмі бедныя. Можна ў іх жыць, харчавацца і з нашай старонкай больш азнаямляцца. Можна купіць сваю дзялянку-ўчастак, абы толькі быў і трымаўся парадак. Можна на ёй будаваць свой домік, для чаго спатрэбіцца труд і ломік. Тут можна і лодкай пракатацца і з добрым плаваннем *запазнацца*. Можна загараць на пяску, а таксама падыхаць паветрам у бліжэйшым ляску. Курорт, як на дачы — спакойна, без бюракратыі і „спраздачы". Можна жыць як Адам з Евай, абы толькі не ўстаць нагой левай; каб толькі не сарваць забароненны плод. Але наш беларускі род не вельмі рвецца наперад і ўгару, бо знае сваё месца, час і пару.

Калісьці на Бахматах жылі Герасімюкі, адзін род, і дружныя, як блізнюкі. Быў тут вадзяны млын на Арлянцы, былі свае ўчасткі, парадак пры вернай дзялянцы. Малолі збожжа на хлеб і асыпку; адзін дзядзька памёр нават на ахрыпку. Немец выгнаў Герасімюкоў у Дубічы і яны засталіся і майстэрствам і дабратой праславіліся, і даўнавата дзялянку Бахматы передалі пад гміну, каб не корпацца ў пяску і не мясіць гліну.

Чаму ўрочышча-вадасховішча называюць Бахматы? Магчыма на гэту *калёнію* многія ехалі ў сваты. Але, пэўна, *бахмат* — татарскае слова: конь магутны, ваяўнічы, бадзёры і славай „ахутаны". Тут недалёка стаяла царква, што ў зямлю ўвайшла і там сваё месца знайшла. Яе звон можна пачуць з зямлі на Пятра і Паўла, і не ведаю, ці гэта легенда... А мо праўда?!

**Мікалай Панфілюк**

# Новы год у пенсіянераў

У Гайнаўцы з 13 на 14 студзеня Новы год па юліянскаму календару жыхары горада сустракалі вельмі ўрачыста і гучна. Навагоднія балі адбыліся ў Беларускім музеі, рэстаране „Лясьнічанка", клубе „Фурнэль", Гайнаўскім доме культуры ды іншых меншых святліцах горада.

Цешыць душу тое, што на балях гулялі і праваслаўныя, і каталікі, гучалі беларускія і польскія песні ў выкананні мясцовых музычных гуртоў. Арганізатарам балю ў Гайнаўскім доме культуры выступіў Гайнаўскі аддзел Польскага саюза пенсіянераў, якому старшынюе Мікалай Чыквін. У мерапрыемстве ўдзельнічала 170 чалавек. Сярод іх былі лекары, настаўнікі, рабочыя, сяляне і прадстаўнікі іншых прафесій не толькі з Гайнаўкі, але і Беластока, Бельска і другіх мясцовасцей.

Ладжаныя саюзам пенсіянераў мерапрыемствы карыстаюцца ў народзе вялікай папулярнасцю. Гэтая арганізацыя абрала сабе красамоўны лозунг: „Думаем глабальна, дзейнічаем лакальна", а распрацаваны ёю план дзейнасці на 2005 год вылучаецца багаццем мерапрыемстваў. У офісе, на дзвярах якой вісіць інфармацыя аб гадзінах працы аддзела, заўсёды многа наведвальнікаў. Адны прыходзяць, каб стаць членамі Саюза польскіх пенсіянераў, іншыя ўплачваюць членскія ўзносы. Ніводзін наведвальнік не абыдзены ўвагай кіраўніцтва арганізацыі, кожнаму прапануецца шклянка гарбаты або кавы. Хаця пенсіянеры — народ бедны і пакрыўджаны, затое вельмі актыўны.

**Віктар Бура**

## Па-нашаму ці...

Нядаўна „Кур'ер паранны" надрукаваў меркаванні жыхароў Дубіч-Царкоўных наконт двухмоўных назваў і ўжывання беларускай мовы як дапаможнай у працы мясцовай адміністрацыі. Магчымасць увядзення двухмоўя ў гмінах, дзе пражывае больш за 20% няпольскага насельніцтва, дае прыняты Сеймам закон аб нацыянальных і этнічных меншасцях. Аднак гэты закон спознены на дваццаць гадоў — палічыў Сакрат Яновіч. У яго родных Крынках, дзе беларускую дзейнасць вядзе „Віла Сакратэс", двухмоўных шыльдаў не будзе, бо ў Крынкаўскай гміне замала беларусаў.

Нямнога беларусаў таксама ў Белавежы ці Міхалоўскай гміне. Гэта вельмі дзіўна, прынамсі ў гэтым астатнім выпадку. Хаця ў Міхалоўскай гміне пяць праваслаўных прыходаў, а беларусаў няма. Відаць, гэтыя ўстановы не ўплываюць на станаўленне нацыянальнай свядомасці. А мы як гаварылі па-свойму, так і далей будзем гаварыць. Толькі пісаць у гміну па-беларуску не будзем, бо хто чыноўнікам заявы ці граматы пераклала на польскую мову? Наш слаўны літаратар жыве не ў Міхалове, а толькі ў Крынках. Мае ён рацыю, што закон аб нацыянальных меншасцях спознены.

**Дзядзька Захар**

## Памёр бацька Данчыка

Атрымаў я ліст ад спадарыні Юлі Андрусышынай (маці Данчыка) з Нью-Йорка. У лісце яна дзякуе за святочныя пажаданні і дасылае здымкі з паховін свайго мужа. Да здымкаў далучаны „Беларус" ад лістапада 2004 года, у якім Антон Шукелойць піша пра жыццё Паўла Андрусышына: „Быў ён украінцам, у беларускую грамаду прыйшоў дзякуючы сужонству з Юляй Каха免оўскай...".

У тэксце Шукелойца асабліва ўразілі мяне словы: „У нас беларусаў так ужо ўвайшло ў традыцыю, што найлепшыя нашы людзі адыходзяць ад нас да суседзяў. А вось што суседзі прыходзяць да нас і аддаюць нашаму народу свае здольнасці — маўчым. Св. памяці Павал належыць да тых, хто прыйшлі да нас і сымпатыі свае дзяліў з намі не забываючыся пра сваё".

Якім жа свет быў бы цудоўны, калі б на ім было больш такіх людзей. І ў чым перашкода, каб нам такімі не быць? Вучэнне Божае нават нас да чалавечнасці ў суадносінах угаворвае. Ці можа сейбіты слова Божага няшмат сэрца ўкладаюць у сваю місію? А мо людзям лягчэй жыць без разумення праўды пра жыццё і саміх сябе?

**Анатоль Маўчун**



*Кнігу Ю. Весялкоўскага „Ад Гарбачова да Белавежы" можна набыць у нашай рэдакцыі.*

*Цана — 10 зл. (+ кошт пасылкі па пошце).*

# Калядоўшчыкі ў Беластоку

Дваццаць трэцяга студзеня г. г. у забаўляльным клубе „Круг” у Беластоку Галоўнае праўленне БГКТ арганізавала агляд праваслаўных калядных калектываў. Удзельнічала ў ім 27 гуртоў з Усходняй Беласточчыны — дзіцячых, маладзёжных і дарослых. Усіх разам выступіла пад пяцьсот асоб. Кожны гурт прывёз прыгожую гвязду і кожная з іх была іншая, па-другому зроблена, з іншымі кветкамі і ўбранствам. З 27 гваздаў магла б атрымацца шыкарная, арыгінальная рэгіянальная выстаўка.

Адкрываючы калядную ўрачыстасць старшыня ГП БГКТ Ян Сычэўскі сказаў: „Уяўляйма сабе, што ў нашу хату прыходзяць каляднікі, віншуюць нас са святам і просяць дазволу спяваць”.

На пачатку выступілі дзіцячыя калектывы. Першым прасіў дазволу спяваць (а рабілі так усе калектывы) гурт Падставовай школы ў Арэшкаве, што на Гайнаўшчыне. „Ці можна спяваць?” — запытаў прысутных віншавальнік. Зала грымнула: „Спявайце”. Дазвол атрымалі і заспявалі:

*Ціхая ноч, святая ноч,*
*Усё спіць, сніць даўно,*
*Толькі Маці святая ўсцяж*
*Ціха ў яслях люляе Дзіця.*

Затым на эстраду (якая мае завысокія ступенькі) уваходзілі з гваздамі па чарзе дзіцячыя школьныя гурты з Аўгустова, што каля Бельска-Падляшскага, з Ласінкі, што на Гайнаўшчыне, з Рыбалаў (Беластоцкі павет), з горада Беластока — са школ № 4, 25 і 34 ды дзеці з садка № 7 у Бельску-Падляшскім. Усе атрымалі бурныя апладысменты.

Спеў дзетак выклікаў у прысутных асабліва сардэчныя пачуцці, адчувалася вялікая пашана да малых выканаўцаў.

Калі прыйшла пара выступаць дарослым, марафон калядак працягнулі „Куранты” песняй:

*Ой, на моры, моры*
*Ды на сінім, сінім,*
*Шчодры вечар,*
*Шчодры вечар!*


Бельскія „Куранты”

„Куранты” і хор Гайнаўскага дома культуры выступалі з нотамі ў руках, а дырыжыравала імі Аліна Негярэвіч. Абодва хоры зусім не напаміналі калядных валакальнікаў, а выглядалі на прафесіянальных выканаўцаў цудоўных праваслаўных калядак.

Сапраўднымі вясковымі каляднікамі прадставіліся „Чыжавяне” з Чыжоў, што ў Гайнаўскім павеце. З прыгожай гвяздай, з музыкантам, мужчыны ў кажухах, жанчыны ў цёплых хустках на галовах ды шырокіх спадніцах у палоскі, энергічна прэзентаваліся з калядняй песняй на сцэне. Заспявалі яны „Слава ў вышніх Богу” і „Заспявайма хрысціяне”. У вясковай вопратцы сімпатычна выглядалі таксама члены хораў „Рэчанька” з Козлікаў, „Малінкі” з Маліннікаў, „Арэшкі” з Арэшкава і „Тыневічанкі” з Тыневіч-Вялікіх.

Усе яны галасістыя, прыгожа адспявалі па тры калядкі. Гэтае ж самае трэба сказаць і аб „Васілёчках” з Бельска-Падляшскага, „Незабудках” з Курашава, аб „Асеннім лісце” з Гарадка, „Арлянах” з Орлі, „Каліне” з Залук, „Збучанках” са Збуча, „Цаглінках” з Ляўкова і „Нараўчанках” з Нараўкі. Гэты апошні гурт — восем жанчын і пяць мужчын з дзвюма гітарамі і двума акардэонамі — дасканала выканаў тры калядкі. У адной з іх наступныя словы:

*Рождество Христово ангел пролетел,*
*Он летел по небу, людям песню пел:*
*Все люди ликуйте, сей день торжествуйте,*
*Днесь Христово Рождество.*

Гурт „Журавінкі” з Агароднічак Супрасльскай гміны, некаторыя калядкі звязаў з Супраслю, аднайменнай рэчкаю і сваёй мясцовасцю. Іх песні набралі мясцовы асаблівы каларыт.

Закончыўся агляд выступленнем маладзёжнага калектыву „Дубіны” з Дубін. У калектыве чатыры музыканты, якія ігралі і спявалі на высокім мастацкім узроўні. Асаблівае захапленне публікі выклікала 8-гадовая дзяўчынка з кошычкам на падарункі, у які атрымала яна ад Валянціны Ласкевіч шакалад. Найбольш апладысментаў атрымала дзяўчынка і выкананая ёю калядка, якая пачынаецца словамі:

*Учора звячора,*
*Засвяціла зора.*
*Зора засвяціла —*
*Свет узвесяліла.*

Узвесяліліся таксама і сэрцы людзей. Некаторыя спявалі калядкі разам з каляднікамі на сцэне.

**Міхась Хмялеўскі**

## Веласіпедныя сцежкі

Мой сябра, калі мы так успаміналі мінулагоднія супольныя веласіпедныя вандроўкі па сцежках Гайнаўшчыны і Арляншчыны, падсунуў мне думку для распрапагандавання сярод улад Гайнаўскага і Бельскага паветаў. А думка такая: выкарыстаць чыгуначны пуць паміж Гайнаўкай і Бельскам на веласіпедную сцежку. Проста сказаць, цяжэй зрабіць. Для мяне напэўна, але не для ўлад, якія маюць усе магчымасці дзеля таго: вопытных чыноўнікаў, разумных начальнікаў, якім залежыць, каб жыхарам Гайнаўшчыны і Бельшчыны жылося выгадней. Ну, і каб турысты мелі дзе катацца на веласіпедах.

Пэўна, інвестыцыя не малая, але Еўропа ахвотным развіваць рэгіянальную інфраструктуру ў экалогіі і турызме дапамагае цвёрдай еўрапейскай валютай. Вядома, трэба мець свой уклад. Як яго знайсці гэта і задача радных, старастаў ці прэзідэнтаў. На тое яны і згадзіліся, каб іх, а не каго іншага, выбралі на ўладныя пасады.

Такая веласіпедная сцежка, шыкарная, выгодная, далёка ад машын, затым бяспечная, гэта ж проста скарб для здароўя і кішэні. Замест цягнуць машыну ў горад або плаціць немалыя грошы за аўтобус, сядаеш на веласіпед і за паўгадзінкі, не спяшаючыся, апынешся ў горадзе.

Для турыстаў трэба было б даць поўную трохмоўную інфармацыю на ўказальніках у пасёлкі, вёскі і гарады. Каб турыстаў звабіць да сябе, трэба пераканаць іх не толькі экзотыкай, але і выгоднай кватэрай, і смачнай беларускай кухняй.

Маладзец сябра, што такую думку падсунуў. Я ў сваю чаргу перадаў яе не абы-каму, але раднаму Гайнаўскага павета Міхасю Андрасюку, які ўзначальвае Самаўрадавы форум і віцэ-старасту Бельскага павета Пятру Божку. Абодва прапановай зацікавіліся. Што з гэтага атрымаецца — паглядзім, пабачым.

**(мк)**

## Колішняе калядаванне

*Па многіх падляшскіх вёсках у перыяд Раджджаства Хрыстовага ходзяць каляднікі. У пераважнай большасці гэта групы дзяцей, часам прывезеныя бацькамі нават з даволі аддлеглых вёсак, або царкоўныя харысты, якія збіраюць грошы на будову храма. Такія каляднікі штогод з'яўляюцца ў Бацьках каля Сямятыч. Старажылы ўспамінаюць, што калісьці формы калядавання былі больш разнастайныя. 74-гадовая Марыя Семянюк, ураджэнка суседняй Раманоўкі, пра даваенныя калядныя традыцыі расказала мне наступнае:*

*— З гвяздай хадзілі хлапчукі. Дзяўчаты калядавалі, але ўжо без гвязды. Надта папулярнымі былі гурты „кракавякаў” і „гэрадаў”. Гэтыя першыя мелі ў сваім складзе маладуху, дружак і тытульнага „кракавяка”, які, пакуль заваяваць сэрца жаданай панны, мусіў праспяваць нямала спецыяльных песень. У саставе гурту „гэрадаў” было 8-10 чалавек, у тым ліку анёлы, чэрці, смерць з касою, а іх выступленне патрабавала вялікага памяшкання, бо не на кожнай кухні, дзе звычайна прымалі каляднікаў, змясціліся б яны ўсе. У хаты, дзе былі малыя дзеці, ахвотна наведвалася „каза”, якая забаўляла малеч.*

*На гагатуху — Шчодры вечар перад Новым годам — гэтак званыя „цыганы” (група жанатых мужчын) наведвалі тыя дамы, у якіх пяклі бульбяную кішку. Калі іх не пачаставалі гэтай стравай, выходзячы маглі з сенцаў прыбраць з сабою цэлую бляху гэтага смакоцця.*

*Сёння, апрача ўспамінаў, нямнога засталося ад гэтых вясёлых звычаяў. Сучасныя каляднікі пераважна спяваюць адну і тую ж калядку ва ўсіх дамах і толькі гвязда становіцца матэрыяльным сімвалам сувязі з адыходзячай у забыццё традыцыяй.*

***

*У старажытным Мельніку захаваліся яшчэ рэшткі колішніх абычаяў. Належыць ім, тыповы, мабыць, толькі гэтаму мястэчку, незвычайны спосаб калядавання.*

*Пачынаецца яно пасля вячэрняга набажэнства ў царкве, калі звычайна нешматлікая група людзей пачынае абыходзіць дамы праваслаўных вернікаў паводле традыцыйнага маршруту, які пралягае праз усё мястэчка. Каля кожнага дома спяваюцца дзве калядкі, а затым каляднікі віншуюць гаспадароў наступнымі словамі: „Поздравляем вас с праздником Раждждества Хрыстова, дай Бог што б в шчасцю, здоровью прожывалі і на будушчый год дождалі!” Выказваючы падзяку мельнічане не давалі каляднікам грошай, толькі частавалі іх пячэннем і цукеркамі, а калі на дварэ стаяў моцны мароз, прапанавалі чарку гарэлкі. Часта да групы каляднікоў далучаліся павіншаваныя гаспадары, так што ў канцы маршруту гурт калядоўшчкаў налічваў пад сотню асоб рознага узросту — дзяцей, моладзі, дарослых і старэч.*

*Такое каляднае вандраванне і велічанне нованароджанага Божага Дзіцяткі працягваецца некалькі гадзін, да позняй ночы. Тады многія каляднікі не вяртаюцца дамоў, толькі ідуць у царкву на ўсяночную.*

*Гэта вельмі стары абычай. Старажылы кажуць, што так было заўсёды (з перапынкамі ў час ваенных акупацый). Несумненна, што гэтая традыцыя выводзіцца з даўняга часу, калі людзі ўмелі жыць у згодзе, у дружнай супольнасці, якая сфармавала воблік мястэчковай грамадскасці Мельніка. Дай Бог, каб гэтае незвычайнае калядаванне захавалася на доўгія гады і то не толькі дзеля каштоўнасці традыцыі, але і для мацавання еднасці членаў рэлігійнай супольнасці.*

**М. Ц.**

## Я таксама шукаю спонсараў

**Я толькі падумаў пра аб'яву, а Мікалай Лук'янюк у „Ніве” ад 26 снежня 2004 года ўжо звярнуўся да спонсараў з заклікам дапамагчы яму выдаць зборнік вершаў.**

**Відаць, у аднолькавым часе з'явіліся ў нас такія самыя думкі і патрэбы, з тым што я намерваюся выдаць падборку сваіх ніўскіх карэспандэнцый і таксама шукаю спонсараў.**

**Каб выдаць такі зборнік, кіруюся не чым іншым, як толькі інтуіцыяй, што яго чакаюць чытачы, каб прыпомніць сабе мінулае.**

**Не пад сілу мне самому прафінансаваць выданне кніжкі, а ўсе беларускія выдавецтвы ў Польшчы, да якіх я звяртаўся, бедненькія як тая касцельная мыш.**

**За зацікаўленне аб'явай шчырае дзякуй.**

***Міхась Куптэль, Сопат***



Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка
для дзяцей і моладзі

# Мядзведзь



Дзеці з Тымянкі — фота з архіва „Зоркі”

Ці ведаеце, скуль узяўся мядзведзь? Мядзведзь перш быў такі ж самы мужык, як і ўсе мы, гарапашнікі. Даўно тое было. Людзей было мала. Гэта цяпер так народу намножылася, што чуць зямля іх паднімае. Каб не ўмерлі, то б неба падперлі. А даўней людзі жылі там-сям па лесе, лавілі звяроў, птушак, а ў азёрах ды ў рэках — рыбу. Улетку збіралі ягады, грыбы або капалі карэнне і запасалі на зіму. Больш усяго запасалі арэхі і мёд. Пчол было тады багацька. Яны самі вадзіліся ў дуплах, і ў зямлі, і норах. Па лесе і цяпер яшчэ е пчолы ў дуплах. Іх называюць слепат. Людзі шукалі пчол у дуплах, і хто перш знайшоў, таго і былі тыя пчолы. Ён абвязваў тое дрэва, дзе знайшоў пчолы, і ўжо ніхто не мае права іх чапаць. Але быў адзін гультаяваты мужык. Яму не хацелася самому шукаць пчол, дык ён выдзіраў чужыя. Толькі цяжка яму было ўлазіць на дзерава. От пачаў ён шукаць такога чарадзея, які б зрабіў, каб лягчэй было лазіць на дзерава.

За сямю лясамі ды за сямю балатамі жыў такі чарадзей, што ўсё мог рабіць. Пайшоў да яго той чалавек. Ідзе ён ды ідзе лесам, бачыць — ліпа абвязана, думае — пчолы. Падышоў бліжэй, зірнуў, аж дупло зусім нізка, а ў ім мёд. Выдраў ён тыя пчолы і пайшоў далей. Бачыць — другое дзерава абвязана. Выдраў ён і тыя пчолы. Падыходзіць к зямлянцы таго чарадзея. А яго няма дома. Глядзіць, аж тут жа пры самай зямлянцы ў дзераве пчолы. Давай гэта ён іх драць. Але вось ідзе чарадзей. Зірнуў ён на таго чалавека ды і кажа:

— Ну, з гэтае пары і ты, і твае дзеці, і ўвесь твой род будзеце толькі пчол драць.

І абярнуў чарадзей таго чалавека ў мядзведзя. Так от адкуль узяўся мядзведзь.

*(з беларускай міфалогіі)*

## Вершы Віктара Шведа

### Шчаслівы сынок

*Сустрэў сваю сяброўку Зосю*
*Пасля канікул летніх Ваня,*
*І расказаў аб сваім лёсе*
*З надта вялікім хваляваннем.*

*— Відаць, мяне кахае матка —*
*У гэтым я пераканаы.*
*Штогод у маткі новы татка,*
*А я з матуляй пастаянна.*

### Чаму малюешся, матуля?

*— Чаму малюешся ты штодзень? —*
*Спытаў сыночак маці.*
*— Хачу, мой дарагі, Валодзя,*
*Людзям я падабацца.*

*А Валодзя неўзабаве*
*Запытаўся зноўку:*
*— А калі пачне, цікава,*
*Дзейнічаць афарбоўка?*

### Люты

*Месяц люты, вось, лютуе: снегам дзьме, насы марозіць,*
*Шыбы ў срэбны ліст малюе, Зімку-паню ў санях возіць,*
*Ад бомаў яго коней дрыжыкі бягуць па спінцы:*
*Бомы дзынькаюць і звоняць, а ў пуховае пярынцы*
*Спіць зямля, і не прачнецца, пакуль сонца не пагрэе,*
*Месяц сакавік пачнецца, месяц Люты пасівее*
*І паедзе з маразамі ў каляндар, у новым годзе.*
*Дык нацешмася мы з вамі у зімовым карагодзе.*

**Міра Лукша**

# Мы хочам ведаць беларускую мову



Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Вучні Падставовай школы н-р 5 добра ўспамінаюць ёлку

У Падставовай школе н-р 5, якая нядаўна ўвайшла ў састаў Комплексу школ н-р 1 у Гайнаўцы, многа дзетак рашылася вучыцца беларускай мове. Дырэкцыя запланавала стварэнне ў гэтым годзе дзвюх груп, для якіх вяліся б заняткі па беларускай мове. Пасля сустрэч з бацькамі аказалася, што вучняў ахвотных вучыцца па-беларуску больш чым меркавалася, у выніку чаго створаны былі чатыры групы з дадатковым навучаннем беларускай мовы. Амаль усе дзеткі, якія вучацца па-беларуску, разам з настаўніцай Алінай Новік прыбылі на ёлку ў гайнаўскі музей. Другакласнікі згадзіліся расказаць, чаму рашыліся хадзіць на ўрокі беларускай мовы.

— Мы хочам ведаць беларускую мову, каб перадаваць яе наступным пакаленням. Дома мае бацькі гаворацъ па-беларуску і звяртаюцца да мяне на гутарковай беларускай мове. Хочуць яны, каб мы з братам умелі гаварыць па-беларуску, так як гаварылі нашы дзяды. На ўроках беларускай мовы мы знаёмімся з беларускімі песнямі і вершамі. Наша пані цікава вядзе заняткі і расказвае нам беларускія казкі, — заяўляе Уршуля Назарук. Яе брат Павел Пётр Назарук таксама захоплены беларускімі заняткамі.

— Мая старэйшая дваюрадная сястра ходзіць на ўрокі беларускай мовы. Я чула ад яе, што гэтыя заняткі цікавыя. Мне падабаюцца яны, настаўніца нам многа чытае і расказвае, — гаворыць Наталля Васілюк.

— Мяне брат пераканаў, што беларуская мова файная і цікавая. Пасля мне будзе лягчэй вучыцца рускай мове, — кажа Д’яна Зузанна Сушч.

— Дзеткі і бацькі многа добрага чулі аб Гімназіі з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Гайнаўцы. Многія дзеткі, якія ходзяць на ўрокі беларускай мовы, хочуць туды паступаць, — дабаўляе настаўніца беларускай мовы Аліна Новік.

**Аляксей Мароз**

# Гарлачык белы — II

*(заканчэнне; пачатак у папярэднім нумары)*

На жаль, мала хто пазнае свой цудоўны лёс у ягоным сапраўдным абліччы — бо абліччаў тых можа быць мноства. Млынароўна раўнадушна паглядзела на Янку. Раўнадушна зірнула і на куфэрак у ягоных руках. Але калі вечка куфэрка адчынілася, Адэля раптам уся страпянулася, вочы яе запалалі… У куфэрку ляжала сапраўдная каралеўская карона — залатая, упрыгожаная каштоўнымі камянямі і перлінамі. Яна ззяла, нібыта адбітак сонца ў рачных хвалях. Адэля дрыготкімі рукамі дастала з куфэрка сваю мару, павольна ўсклала цяжкі сімвал улады на сваю горда ўзнятую галаву…

Янка тужліва і захоплена глядзеў на сваю каралеву.

— Якая ты прыгожая, мая каханая. Ты сапраўды магла б быць каралевай — так пасуе табе карона. Я выканаў тваё жаданне — гэтая карона дакладна такая ж, як у нашага караля. Цяпер ты пойдзеш за мяне, маё шчасце?

Адэля ганарыста зірнула на кавалл.

— Дзякуй за падарунак. Карона амаль як сапраўдная. Амаль… Бо хіба ёсць пры ёй каралеўства? Хіба шлюб з табой узвядзе мяне на трон? Ці хаця б у княжацкі палац? Змяняць млын на кузню — невялікі гонар.

Зусім сцямнеў з твару Янка. Доўга глядзеў ён на дзяўчыну. І маўчанне яго было цяжкое, як навальніца.

— Праўду кажуць, — нарэшце вымавіў ён, — што з твару вады не піць. Галоўнае — добрая душа. Каб зрабіць табе гэтую карону, я тысячу разоў пабачыў смерць. Я ўваходзіў у чужыя палацы, дзе мармуровая падлога была слізкай ад крыві. Я ўварваўся ў скарбніцу самога султана — адтуль вось гэты смарагд



Дзяўчынкі з беларуска-польскага садочка
Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

на тваёй кароне і гэты шнар на маім твары. Мяне лічылі сквапнікам, бо замест узнагарод і прывілеяў я заўсёды прасіў падараваць мне золата і дыяменты. Які ж я быў сляпы! Карона нікога не зробіць каралём. І тым больш не падорыць кахання.

І Янка сарваў з галавы Адэлі залатую карону, хуткім крокам падышоў да ракі і шпурнуў здабытак многіх цяжкіх гадоў у вір, у самае глыбокае месца. Быццам маланка палыхнула яна ў хвалях.

Ускрыкнула Адэля, кінулася да ракі. Зазірнула ўглыб — але там была адна халодная цемра. Паглядзела на госця — ды ўбачыла толькі ягоную спіну: Янка цвёрдым крокам ішоў у бок вёскі, каб ніколі не вярнуцца да таго месца, дзе пагасла ягоная мара.

І тады першы раз Адэля адчула ў душы невымоўную скруху. Першы раз варухнуўся ў душы страшны сумнеў і нелюбоў да сябе. Дзяўчына апусцілася на калені над вірам і слёзы самі сабой паліліся з прыгожых сініх вачэй, што ўмелі паглядаць гэтак ганарыста і раніць сэрцы наіўных. Слёзы раскаяння падалі ў вір, і паступова ў яго глыбінях пачало ўтварацца святло. Светлая пляма ўсё ярчэла, набліжалася да паверхні вады, і ўрэшце з цёмных хваляў вынырнула цуда — белая кветка, падобная да каралеўскай кароны.

Кветка нарадзіла іншыя кветкі, і дзяўчаты вечарамі прыходзілі любавацца, як развінаюцца пяшчотныя снежныя пялёсткі. Назвалі кветку гарлачыкам — бо нагадвала яна па форме гарлачык, збанок. Гэта, вядома, не такая высакародная рэч, як карона, але затое сумленна служыць добрым людзям. І няма ў спёку лепшага падарунку для жняі, чым гарлачык з прахалодным малаком.

Але рваць белыя гарлачыкі лічылася грэхам. І яны спакойна гайдаліся на хвалях. Гэта цяпер людзі не зважаюць на наступствы, думаюць толькі пра тое, як займець самому і пабольш, і не відаць сёння гарлачыкаў на нашай рацэ.

Ты пытаешся, што ж далей сталася з Адэляй ды Янкам? А ты спытай пра гэта ў кагосьці з Кавалёвых — людзей з такім прозвішчам шмат у нашай вёсцы. Можа хтосьці з іх успомніць пра сваіх прапрапрабабулю і прапрапрадзядулю, Янку і Адэлю. Так, Адэля зразумела, якую карону і якое каралеўства мог падарыць ёй Янка — вянец кахання ярчэйшы за сонца.

І ты, калі ўбачыш раптам белы гарлачык, гэтак падобны да кароны, не спяшай забіць яго, сарваўшы, абы на кароткі час прыўлашчыць сабе. Лепей палюбуйся ім, каб яго прыгажосць назаўсёды засталася ў тваім сэрцы, як і каханне да Радзімы.

*Людміла Рублеўская*

# Міжнародны дзіцячы конкурс

МГА „ЗБС «Бацькаўшчына»" адпаведна штогадовай традыцыі абвяшчае ў 2005 г. Міжнародны дзіцячы літаратурна-мастацкі конкурс **„Там, ля сівых муроў…"** Конкурс прысвячаецца беларускім дзеячам і арганізацыям, лёс і дзейнасць якіх былі звязаны з Вільняй канца XIX — пачатку XX ст. і 300-годдзю Францішкі Уршулі Радзівіл. Міжнароднае грамадскае аб'яднанне „Згуртаванне беларусаў свету «Бацькаўшчына»" запрашае да ўдзелу ў конкурсе школьнікаў 12-14-гадовага ўзросту.

**Тэмы конкурсу:**

1. Вільня ў духоўным жыцці беларусаў.

— Пра значныя падзеі беларускай гісторыі і культуры, звязаныя з Вільняй;

— пра ролю беларускіх палітычных і культурніцкіх арганізацый (установ) Вільні ў станаўленні беларускай дзяржаўнасці;

— пра выбітных беларускіх дзеячаў, лёс якіх быў звязаны з Вільняй.

2. Магнацкія роды на Беларусі.

— Пра ролю магнацкіх родаў Беларусі ў гісторыі і культуры бацькаўшчыны (мецэнацтва, помнікі архітэктуры, асвета, тэатры, музеі і г.д.);

— пра цікавыя (адметныя) эпізоды жыцця і дзейнасці асобаў магнацкіх родаў Беларусі.

Конкурс будзе адбывацца па дзвюх намінацыях: мастацкія працы (малюнкі) і літаратурныя творы. Усе працы павінны мець наступныя звесткі: прозвішча, імя ўдзельніка, узрост, поўная дата нараджэння, зваротны адрас з індэксам, па магчымасці, кантактныя тэлефоны. Прымаюцца малюнкі памерам А-3 (420 х 295) і А-2 (420 х 590), а таксама літаратурныя творы (апавяданні, вершы, сачыненні, нарысы і інш.) аб'ёмам да 10 друкаваных старонак. Пераможцы будуць узнагароджаны. **Працы на конкурс прымаюцца да 20 красавіка 2005 г.**

Творы дасылаць на адрас рэдакцыі бюлетэня:

Інфармацыйны бюлетэнь „Беларусы ў свеце", МГА „Згуртаванне беларусаў свету «Бацькаўшчына»", 220030 Рэспубліка Беларусь, Мінск, вул. Рэвалюцыйная, 15

*Інфармацыйны цэнтр*
*МГА „ЗБС „Бацькаўшчына"*

# Польска-беларуская крыжаванка № 6

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.




**Адказ на крыжаванку н-р 2:** Пашпарт, чын, іголка, смак, бібліятэка, лік, нос, гара, араты. Конь, сіла, імбір, галка, шчокі, пыл, яна, банкет, арэна, сто, кот, валасы.

Узнагароды, **запісныя кніжкі**, выйгралі: **Пятрусь Герасімюк, Эля Анджаеўская, Рафал Тамашук** з Дубін, **Міхал Кананюк, Эмілія Іванюк, Паўліна Лук'янюк** з Нарвы, **Эвеліна Гайко, Аня Селеванюк, Габрыель Ярацэвіч** з Бельска-Падляшскага, **Ева Багроўская** з Дубіч-Царкоўных, **Аня Харкевіч, Юліта Скепка** з Нараўкі. Віншуем! Узнагароды можна ўзяць у рэдакцыі або чакаць іх у сваёй школе.

# „Маланка” бліскае ўжо 15 год

Калектыў беларускай песні „Маланка” з Бельска-Падляшскага, які на Беласточчыне ўспрымаецца вельмі цёпла і пасняхова расслаўляе беларускія песні па-за яе межамі, рыхтуецца да юбілею 15-годдзя свёй удалай дзейнасці. За гэты перыяд выступіў ён з 345 канцэртамі ў Польшчы, Беларусі, Расіі, Францыі і Германіі, выдаў некалькі аўдыёкасет і кампакт-дыскаў з беларускімі песнямі. Вынікі дзейнасці бельскіх любіцеляў беларускай песні будуць падведзены ў час юбілейнага канцэрта, які адбудзецца 4 лютага (у 17 гадзін) у Бельскім доме культуры.


Фота МАРКА ХМУРА

У такім складзе „Маланка” выступала ў Маскве і Белавежы

— Калектыў „Маланка” ўзнік ў час крызісу, які турбаваў хор „Васілёчкі”. У час І Агульнапольскага фестывалю беларускай песні хор не выступіў. Першае месца заняў тады бельскі тэрцэт Лідзія Маліноўская, Аліна Бурыла (зараз Ваўранюк) і Багуслава Карчэўская, а на другім месцы апынуўся бельскі дуэт Яўгенія Барысюк і Кастусь Селевановіч. Мікола Бушко, які тады вёў мерапрыемства, пачуў ад нашых жанчын такую вось фразу: „Мы спяваем песні задзёрна, як маланка” і назваў бяльшчан калектывам „Маланка”. Летам 1990 года згаданыя тэрцэт і дуэт аб’ядналіся. Далучыліся да іх Крысціня Андраюк-Вапа і Юрка Харкевіч. Калектыў захаваў агучаную ў час фестывалю назву „Маланка”, — успамінае першыя гады дзейнасці мастацкі кіраўнік „Маланкі” Сяргей Лукашук, які раней на працягу 20 гадоў кіраваў хорам „Васілёчкі”.

У 1991 годзе да калектыву далучаецца інструментальная група: Андрэй Нікіцюк — акардэон; Сяргей Лукашук — скрыпка; Лявон Кудзін — кларнет, Багдан Шульц — бубен; Збігнеў Гуз — бас. Калектыў папаўняецца яшчэ дзвюма жанчынамі — Алінай Шумялюк і Святланай Кобуз. Удзельнікі „Маланкі” спатыкаюцца на рэпетыцыях, рыхтуюць шмат песень, выступаюць на Рэспубліканскім фестывалі народнай музыкі ў Гродне і ў снежні 1991 года выдаюць сваю першую аўдыёкасету — больш дваццаці беларускіх песень. З гэтага часу калектыў працуе вельмі плённа. Выступае на многіх канцэртах і выпускае чарговыя касеты.

— Рэпертуар для „Маланкі” падбіраў я са зборнікаў беларускіх песень, карыстаўся мясцовым фальклорам і вопытам калектываў з Беларусі. Нашы песні — жывыя, вясёлыя і жартаўлівыя, вельмі добра падыходзяць да інструментальнага акампанементу і прэзентацыі на сцэне. Песні такога характару, як „Цячэ вада ў вярок” або „Ішлі хлопцы з ярмаркі” вельмі добра ўспрымаюцца публікай, — аналізуе першыя крокі калектыву яго кіраўнік Сяргей Лукашук, які музычныя веды здабываў у Педагагічным ліцэі ў Бельску-Падляшскім, а пасля ў Варшаўскай музычнай акадэміі. Ён — настаўнік музыкі і інструктар бельскіх дзіцячых і маладзёжных калектываў, у якіх рэпертуары беларускія песні.

„Маланка” вельмі хутка становіцца вядомым і папулярным калектывам на Беласточчыне. Да яго далучаюцца Марыя Саўчынская, Іаланта Панфілюк, Анатоль Нічыпарук і Марк Хмур. Спевакоў з Бельска запрашаюць на канцэрты ў Беларусь. У 1992 годзе Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь падарыла калектыву народныя касцюмы, а пяць гадоў пазней перадасць новыя.

— Мы запрапанавалі новую формулу перадачы музыкі на Беласточчыне, багатую аранжацыю і цікавы рэпертуар, — кажа Сяргей Лукашук. — У калектыве былі любіцелі спеву і беларускіх песень. Калі публіка добра ўспрымала нашы выступленні, была ахвота спяваць. Мы сталі вельмі актыўнай групай і часта ездзілі на канцэрты.

У 1992 годзе паяўляецца аўдыёкасета „Маланкі” з народнымі калядкамі. У маі 1993 года калектыў выязджае ў Францыю і выступае з канцэртамі ў час Свята Еўропы арганізаванага ў Сен-Ламбер ду Латай (Saint Lambert du Lattay). У лістападзе гэтага ж года „Маланка” выязджае з канцэртам у Бад-Эсен (Bad Essen) у Нямеччыне.

Калектыў „Маланка” прымае ўдзел у многіх фестывалях, аглядах, конкурсах, фэстах і фальклорных мерапрыемствах у Беларусі і выязджае з канцэртамі ў Маскоўскую вобласць. Выступае ён на Аглядах мастацкіх дасягненняў нацыянальных меншасцей у Польшчы (Варшава, Гданьск, Дабродзень, Млынары, Пуньск), у Міжнародным фестывалі Тыдзень бескідскай культуры і Фестывалі карпацкай музыкі. Аднак найбольш разоў „Маланка” ўдзельнічае ў Агульнапольскім фестывалі беларускай песні. Становіцца яна лаўрэатам узнагароды Гран-пры і шматразовым лаўрэатам першай узнагароды гэтага фестывалю. Першы кампакт-дыск „Маланкі” паяўляецца ў 1999 годзе.

— У нашым калектыве сямейная атмасфера. Кожны год даем каля 20 канцэртаў. Замежная публіка ўспрымае нас вельмі цёпла. Польская публіка таксама нам прыхільная. Пасля канцэртаў людзі падыходзяць да нас і дзякуюць за выступленні, — радуецца Сяргей Лукашук.

Зараз у калектыве выступае 17 асоб. Кіраўніком па арганізацыйных справах з’яўляецца Канстанцін Селевановіч, які дапамагае Сяргею Лукашуку весці калектыў. Да юбілею „Маланка” падрыхтавала чарговы кампакт-дыск „Гэй, іграй гармонік...”. Загаловак узяты з песні прэзентаванай на дыску.

— „Бо пакуль яшчэ гармонік наш іграе, беларусы будуць жыць”, — падспеўвае Сяргей Лукашук, які большасць свайго жыцця аддаў прапагандаванню беларускай песні. Адна з песень на кампакт-дыску прысвечана нядаўна памерламу члену „Маланкі” Юрку Харкевічу. На дыску знаходзяцца прыгожыя беларускія песні, якія будуць выконвацца ў час юбілейнага канцэрта.

**Аляксей Мароз**

# Лірнік па аўтэнтычных узорах

*Кампакт-дыск — Алесь Лось, „Ліра” (14 лірніцкіх песень, псалмоў і кантаў з суправаджэннем ліры). Праект: „Прошча”, Менск 2004.*

Ужо з першай песні праймае нас біблейска-прарочы настрой. „Песнь аб Страшным судзе”, запісаная дваццаць гадоў таму ў вёсцы Ульянаўка Слуцкага раёна, гучыць на здзіў актуальна: *Уся зямля затрасецца, белы ж камень распадзецца...*

Лірнік Алесь Лось (ён жа дудар, скрыпач, бубнач, гітарыст, спявак, майстар этнічнага танца, графік, іканапісец), быццам св. Міхаіл з названага твора, абуджае дух мінулага. Ён выводзіць на святло прызабыты лірніцкі жанр і выканаўцаў — лірнікаў, вядомых таксама як вандроўныя старцы, дзяды сляпыя, кабзары. Іх роля ў падтрымцы чалавечай годнасці неацэнная. Як сведчаць этнографы XIX ст., лірнікаў шанавалі і прымалі ў кожным двары. Яны ўвасаблялі ідэю дабрыні, справядлівасці, патрыятызму. Песні пад ліру звыклася называць поснымі, іх спявалі переважна ў Піліпаўку, Вялікі пост, Пятроўку, Спасаўку. Ніводзін вялікі царкоўны фэст, царкоўнае свята, незалежна ад канфесіі, цягам стагоддзяў не абыходзіліся без лірніцкіх спеваў. Ліра гучала ў шляхецкіх дварах, там звычайна славіўся гераізм ваяроў Айчыны.

Ліра прыйшла на Беларусь з Захаду ў канцы XVI стагоддзя. Вядома, што ў XVII-XIX стст. у Магілёве і Слуцку дзейнічалі г.зв. брацтвы лірнікаў. Мелі свой слэнг і абрады. Часта, напрыклад, асляпляліся. Каб вандраваць па краіне, карысталіся дапамогай вучняў, якія з часам пераймалі іх майстэрства. Апошнія лірнікі сустракаліся яшчэ ў канцы 60-х гадоў XX ст. на Палессі.

Алесь Лось займаеццааднаўленнем корбавай ліры па аўтэнтычных узорах і рэканструкцыяй лірніцкага спеву як жанру з 1985 года. Творы запісаныя на дыску ўражваюць разнавіднасцю так стыляў як і рэгіёнаў. Тут шырокавядомыя шэдэўры лірніцкага жанру як „Лазар” ці „Песня аб св. Гаў-


Лірнік з Пінска, 1920-я гады

рыіле”. Беласточчыну прадстаўляе псалом „Pieśń do świętej Filomeny”, запісаны ў Серках ля Тыкоціна...

Сучаснага слухача ўразяць творы на маралізатарска-бытавыя тэмы. Зместам нагадваюць сённяшнія сенсацыйныя аповеды і рэпартажы пра выкідыш, зброд, нявернасць. Аднак, у адрозненні ад апошніх, у лірніцкіх творах, следам злачынства ідзе пакаранне. Вось у „Марусечцы”, песні пра маці-дзетазабойцу, пакаранне такое як правіна — лёгкадумную гераіню топіць у глыбокім *Дунаю*. Аднак, пакуль дзеўку паглыне хваля, яна паспее яшчэ павучыць лёгкадумных сяброўак, *каб не хадзілі па начлегах.*

Іншыя песні, як „Не шумі дуброўка”, „Дарожка”, „Ванюша”, „Не ляжы ветру ў полі” (апошняя запісана яшчэ Міхалам Федароўскім) уражваюць паэтычным кодам, які сустрэнем у самых старажытных народных песнях.

Кожны, хто праслухае дыск „Ліра”, зразумее, чаму Алесь Лось стаў сенсацыяй на Фестывалі ігры на старажытных інструментах у Яраславе (Польшча). Хоць лірніцкія песні падобныя зместам і формай ва ўсёй Еўропе, выкананні Лася лічацца асаблівымі. Тут уключаны не толькі рэгіянальныя адценні жанру, але і яго філасофія. Цікава, што „Ліра” Алеся Ласа мае ўжо прызнак культавай у асяроддзях польскіх антыглабалістаў. У нас — думаю — захопіць і аб’яднае ўсе пакаленні. Кампакт можна прапанаваць як маладому слухачу, так і нашым бабулям на час посту.

**Ганна Кандрацюк**

# У гонар Васіля Быкава

У раённых элімінацыях XI выпуску Алімпіяды беларускай мовы, якія адбыліся 19 студзеня ў Агульнаадукацыйным ліцэі з беларускай мовай навучання ў Бельску-Падляшскім, прынялі ўдзел 42 вучні. Арганізатары алімпіяды, якімі з'яўляюцца Кафедра беларускай філалогіі Варшаўскага універсітэта і Таварыства Польшча-Усход, найбольш увагі адвялі вядомаму беларускаму пісьменніку Васілю Быкаву. Гэтым спосабам адзначылі 80-годдзе з дня яго нараджэння.



Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

*Бельскія белліцэісты ў час алімпіяды раіліся са сваёй настаўніцай Аннай Бжазоўскай*

Алімпіяда распачалася з напісання творчых прац. Вучні мелі да выбару тры тэмы:

1. Галоўныя этапы жыцця і творчасці Васіля Быкава.
2. Характарыстыка аповесці Васіля Быкава, прысвечанай ваеннай тэматыцы.
3. Якімі рысамі павінен характарызавацца беларускі пісьменнік.

Апрача напісання творчых прац вучням трэба было перакласці тэкст з беларускай мовы на польскую, акрэсліць час, паставіць у адпаведняй форме займеннікі і правільна паставіць ётавыя літары. Як пасля аказалася, найбольш праблем было з правільным акрэсліваннем часу.

Пасля размоў з белліцэістамі выявілася, што найбольш вучняў пісала на першую і другую тэмы.

— Калі хто чытаў творы Васіля Быкава, то пісьмовыя тэмы акажуцца для яго даволі простымі. Творчасць Быкава зрабіла на мне вялікае ўражанне. Аўтар умела паказвае перажываннi паасобных герояў, цікава прадстаўляе іх псіхіку, унутраны свет і таму падабаюцца мне яго творы, — кажа Юстына Вышкоўская.

— Цяжка мне чыталіся ваенныя творы Быкава і многія словы былі незразумелымі. Аднак я люблю чытаць псіхалагічныя творы. Васіль Быкаў паказвае ўнутранае жыццё людзей і гэта мяне зацікавіла. Проста творчасць Васіля Быкава дасканалая, — заяўляе Барбара Жэрунь.

— Падабаецца мне яшчэ творчасць Наталлі Арсенневай і Алеся Разанава, хаця кожны можа інтэрпрэтаваць іх творы па-свойму.

— Я выбрала характарыстыку пісьменніка, бо гэтая тэма блізкая мне. Я сама паспрабавала пісаць вершы. Найчасцей закранаю рэфлексіўныя і філасофскія тэмы. Мяне цікавіць тэма жыццёвай справядлівасці. Я прыехала жыць у Польшчу з Гродзеншчыны і ў маіх вершах паяўляецца тэма Радзімы — Беларусі. Творчасць Васіля Быкава таксама мяне цікавіць. Ён паказаў вайну па-сапраўднаму і не скрываў адмоўных паводзін герояў, — гаворыць Ірына Станкевіч.

— Я пісаў пра ваенную творчасць Васіля Быкава. Аднак, мне хацелася б выказвацца на тэму не спалучаную канкрэтна з літаратурай, — кажа Марцін Засім.

Яго сябра Вальдэмар Саковіч любіць творчасць Васіля Быкава і Уладзіміра Караткевіча. Сваё зацікаўленне мог выкарыстаць у пісьмовай працы.

— Творчасць Васіля Быкава цікавая, але нялёгкая да аналізу з вучнямі. Калі разглядалі мы яго творы, аказалася, што многа слоў у яго апавяданнях незразумелых для ліцэістаў. Вучні слаба ведаюць ваенную рэчаіснасць у Савецкім Саюзе і таму ім цяжэй зразумець некаторыя справы, — тлумачыць настаўніца Вольга Сянкевіч.

У час вусных адказаў вучні выцягвалі пытанні па беларускай літаратуры. Маглі трапіць на білет, дзе трэба было расказаць пра сваю сям'ю, сяброў, школу, горад, наваколле ці беларускую музыку.

— Прыемна мне паінфармаваць, што ў параўнанні з мінулым годам павысіўся ўзровень вусных адказаў. Відаць, што вучні сур'ёзна рыхтуюцца да гэтай часткі алімпіяды. Аднак, у большасці, вучні лепш арыентуюцца ў літаратуры Вялікага княства Літоўскага і творчасці XIX стагоддзя. Горш ведаюць літаратуру XX стагоддзя і сучасную беларускую творчасць. З творчасцю Васіля Быкава вучням таксама было крыху цяжэй справіцца, — заяўляе старшыня конкурснай камісіі прафесар Аляксандр Баршчэўскі.

— Сярод вучняў, што прыступілі да алімпіяды, многа ліцэістаў другіх класаў. Вучні трэціх класаў рыхтуюцца ўжо да матуральных экзаменаў, — інфармуе настаўніца Анна Бжазоўская. Другакласнікі мусілі за кароткі перыяд засвоіць матэрыял другога паўгоддзя і цэлага трэцяга класа. Таму ім цяжэй было падрыхтавацца да вусных адказаў.

— Сэнс алімпіяды заключаецца ў папулярызацыі беларускай мовы. Самое існаванне яе спрыяе паляпшэнню адносін вучняў да беларускай мовы як прадмета. Ужо фіналісты алімпіяды звольнены з экзаменаў на атэстат сталасці па беларускай мове. Многія вышэйшыя ўстановы лаўрэатаў беларускай алімпіяды будуць прымаць на вучобу без экзаменаў.

— Многа нашых вучняў прымае ўдзел у беларускай алімпіядзе, каб пасля паступіць у вышэйшыя ўстановы. Пасля ўдзелу ў алімпіядзе і дадатковай вучобы будзем лепш ведаць беларускую мову і літаратуру, — заяўляе Наталля Шарко.

**Аляксей Мароз**

# *Мова — матчына ці мацерная?*

*Пятнаццаць гадоў таму — у студзені 1990 года беларуская мова была абвешчана ў Беларусі адзінай дзяржаўнай. Мінулы з тае гістарычнае падзеі час выразна раскладаецца на два перыяды — 5 гадоў развіцця і 10 гадоў нішчання. Цяпер у нас фактычна пануе двухмоўе — беларуская трасянка і расійскі мат.*

*Што да характарыстыкі агульнай сітуацыі, то ўжо абрыдлі „песні жальбы" пра гаротны стан нашай мовы. Так, сапраўды беларуская мова перастала быць такой прэстыжнай, як на пачатку дзевяностых гадоў. Тут нічога не зробіш, зрухаў да лепшага не будзе, пакуль не вернецца дзяржаўная беларусізацыя ў вышэйшыя навучальныя ўстановы. А сама дзейсны спосаб змагання за мову — гэта паўсюль размаўляць па-беларуску. Формула такая — чым больш носьбітаў беларушчыны, тым больш шанцаў на адраджэнне ў прышласці. Веры, якая „ўсіх нас сагрэе", надае і тая акалічнасць, што, нягледзячы на ўсе нішчанні, развівалася беларуская кніжная культура. У кніжках можна знайсці і гістарычную праўду, і харaство роднага слова.*

*З іншага боку не падзяляю аптымізму тых, хто лічыць моўны працэс „нармальным". Сама кепскае ў нашай сітуацыі тое — што саветамі і новымі бальшавікамі фактычна знішчана беларуская вёска, а гэта значыць мова „ад каранёў". Бо „гарадскія" творцы, якія вывучаюць мову па слоўніках і газетах, пасля пачынаюць прадукаваць „хімвалакно" замест „паэзіі чыстай красы".*

*Гвалтоўная русіфікацыя вядзе нават не да змены беларускай мовы, а да змены чалавечай мовы. Бо хто ў Беларусі размаўляе на рускай літаратурнай мове? На вуліцах чуваць пераважна перамешаныя слэнг, мат і нейкае жывёльнае гырканне.*

*Мат укараніўся ў ментальнасць і постсавецкую моўную прастору дастаткова трывала. Падаецца, што гэты элемент выслаўлення дойга будуць перажываць нават тыя краіны, што больш дзесяці год таму вызваліліся ад расійскай палітычнай і ідэалагічнай залежнасці. За час апошніх побытаў у Літве здзівіла, што тамтэйшая моладзь, якая размаўляе па-літоўску, актыўна лаецца матам. Характэрна, што ўласна рускае мовы жмудзінскія маладзёны не ведаюць. Выяўляецца, што мат стаў інтэрнацыянальнай мовай зносін. Нешта падобнае і ў польскім моўным асяродку.*

*У Беларусі, здаецца, ніхто не праводзіў даследзінаў, але, напэўна, адсоткаў 90 насельнікаў краіны (немаўлят не лічым) у сваім лексіконе стала ўжываюць мацерныя словы. Гадоў дваццаць таму такога яшчэ не было. Сёння брыдкаслоўе злятае з вуснаў усіх — ад сямігадовых дзяўчынак да сямідзесяцігадовых дзядкоў (з вуснаў дзяўчынак хіба часцей). Мат мы чуем паўсюль: на працы, у тралейбусе, на вуліцы, на стадыёне, у сям'і. Не дзіва, што такі моўны асяродак актыўна ўплывае на дзіцячую свядомасць і псіхіку.*

*Надзвычай рэдка хтосьці публічна наважыцца зрабіць брыдкаслову заўвагу. Мат усё больш робіцца побытавай звыкласцю. Здзіўляе і пасіўная пазіцыя асноўных хрысціянскіх канфесій. Зразумела, што і Каталіцкі касцёл і Праваслаўная царква паводле свайго вучэння супраць брыдкаслоўя. Але ў шматлікіх казаннях святароў, іх выступах па тэлевізіі нешта не даводзілася пачуць штосьці на гэтую тэму. Школа таксама нічога не можа супрацьпаставіць мацернай лаянцы. Больш таго, сённяшняя беларуская школа як дзяржаўная ўстанова папросту інспіруе шыранне мата ў падлеткаў. Татальная русіфікацыя навучальных устаноў не проста змяняе мову зносін. У дзяцей скрадаюць родную мову як светаглядную духовую каштоўнасць. Гуманней вырваць чалавеку язык, чым пазбавіць яго роднай мовы, бо на чужой мове немагчыма выхаваць псіхічна паўнавартаснага чалавека. Мова — гэта не проста камунікацыйны сродак зносін, яна — найперш духоўная катэгорыя. Сённяшні настаўнік бездапаможны ў змаганні з матам, бо ён сам не мае патрэбнага моўнага імунітэту. Ён не ёсць носьбітам сапраўднае культуры, у духоўным сэнсе ён прадукуе сурагат. Зразумела, што адзінадзейсная „вакцынацыя" ад мата — адраджэнне нацыянальнага школьніцтва, шыранне беларускамоўнай прасторы. У беларускамоўнай гутарцы мацюкі арганічна не прыжываюцца.*

*Усё вартае ў культурным сэнсе можна стварыць толькі на роднай мове. Тварыць на чужой мове гэтак жа цяжка, як падмятаць падлогу сваім языком. Усё, што ў Беларусі створана па-расійску мае другасны, трэцясны характар, ровень ніжэйшага кшталту і гатунку. У нашых варунках душы напаўняе безгустоўная брыдота. Яскравым прыкладам таму рускамоўная песенная папса, дзе на мат яшчэ не перайшлі, але ўжо мала бракуе. Можна сказаць, што ў эфірнай прасторы мат культывуецца і тым самым уводзіцца ў норму. Дастаткова паглядзець любы расійскі фільм апошніх гадоў і падлічыць колькі разоў героі (часцяком станоўчыя!) вымаўляюць „твою мать", „б...ть" і т.п.*

*Выслоўе „аж вушы вянуць" акрамя пераноснага сэнсу мае і натуральнае значэнне. Праведзена нямала доследаў на прадмет уплыву брыдкаслоўя. Выяўлена, што ў памяшканнях, дзе людзі лаюцца, пакаёвыя кветкі вянуць і засыхаюць куды хутчэй. Тое ж і з уплывам на чалавека. Слова — гэта вялікі Боскі дар, яно можа ацаляць, а можа забіваць. Існіна простая і старая як свет. Існіна да канца свету.*

**Уладзімір Хільмановіч**

*Беларуская грамада ў Вялікабрытаніі не самая шматлікая, але не прапасці сярод шэрых англійскіх дажджоў яна здолела...*

## http://homepage.ntlworld.com/pmrodgers/**belarusians**/bel/

Аб тым, што беларусаў рассеяла далёка па свеце сведчанняў шмат. Адным з іх ёсць „прысутнасць” нашых суродзічаў у Інтэрнэце, дзе можна знайсці віртуальныя старонкі самых разнастайных беларускіх арганізацый, якія захоўваюць у сваёй душы сувязь з гістарычнай радзімай. Сёння прадстаўлю беларусаў з туманнага Альбіёна, дакладней, іхні сайт у сусветнай павуціне.

Беларуская грамада ў Вялікабрытаніі, зразумела, не самая шматлікая за межамі нашага этнічнага рассялення супольнасць. Але, тым не менш, не прапасці сярод шэрых англійскіх дажджоў яна здолела. Гэта пацвярджае сайт „Беларусы ў Вялікабрытаніі”.

Калі цікаўны карыстальнік набярэ на камп’ютэры адрас http://homepage.ntlworld.com/pmrodgers/belarusians/bel/, то перад яго вачыма адкрыецца вельмі просценькае па выяўленню відовішча, што складаецца выключна з тэксту.

Наверсе з левага боку ідзе назва сайта, напісаная па-англійску. Злева ніжэй сціпла пададзеныя рубрыкі, колькасць якіх таксама вельмі невялікая. Да іх мы вернемся крыху пазней, а пакуль засяродзім увагу на першай і галоўнай старонцы. Яна, дарэчы, адначасова з’яўляецца і рубрыкай „Навіны, падзеі і абвесткі”. З усіх гэтых падрубрык прысутнічае толькі інфармацыя аб сустрэчы з англійскім навукоўцам, якога з іх гістарычнай краіны дэпартавалі сённяшнія беларускія ўлады. А ён, між тым, займаўся вывучэннем наступстваў ад Чарнобыльскай катастрофы.

Наступная рубрыка прадстаўленая выйсцем да англамоўнай версіі сайта. Такое размяшчэнне пераходу крыху незвычайнае, бо як правіла, ён у рубрыках не падаецца, а выносіцца асобнай кнопкай.

З усіх раздзелаў найбольш карысным з практычнага пункту гледжання можна назваць „Цэнтр у Лондане”. Інфармацыя ў ім змяшчае паведамленне, як знайсці гэты самы цэнтр, які месціцца ў знакамітай Скарынаўцы — беларуская бібліятэка імя Францішка Скарыны ў Вялікабрытаніі. Як да яе дабрацца не толькі распавядаецца і паказваецца на карце, але і ёсць выйсце да сайта бібліятэкі, праз які можна, таксама як і ў даным выпадку, даведацца аб усім, дзякуючы Інтэрнэту. Магчыма, за якісь час мы туды віртуальна зазірнем.

Наступная рубрыка — „Арганізацыі”. Тут ужо месціцца больш падрабязная інфармацыя пра тыя грамадскія і рэлігійныя беларускія аб’яднанні, што дзейнічаюць на туманным Альбіёне. Сярод іх разнастайныя таварыствы, уніяцкая і праваслаўныя цэркввы, а таксама пасольства Рэспублікі Беларусь у Вялікабрытаніі.

Рубрыка „Пра нас” распавядае пра тых, хто і дзеля чаго стварыў даны сайт. І вось, што яны аб гэтым пішуць: „Вэб-сайт *Беларусы ў Брытаніі* служыць усёй беларускай супольнасці ў гэтай краіне. Ён не належыць ніводнай арганізацыі, але служыць патрэбам і інтарэсам беларусаў, беларускіх ініцыятыў і арганізацый. Праз распаўсюд інфармацыі мы імкнемся садзейнічаць усяму цікаваму і карыснаму, што нараджаецца ў беларускім жыцці… Нам часта даводзілася чуць ад наведвальнікаў бібліятэкі ў Лондане і наведвальнікаў беларускіх вечарынаў і святкаванняў, што яны даведаліся пра беларускае жыццё ў Брытаніі праз наш сайт. У гэтым і заключаецца наша адзіная мэта — дапамагчы беларусам і беларускім ініцыятывам не згубіцца на туманным Альбіёне”.

**Уладзімір Лапцэвіч**

*Лаўры лепшага калектыву студзеня бясспрэчна здабыла мужчынская гандбольная дружына, якая выйшла ў плей-оф да чэмпіянату Еўропы...*

# Беларусь, беларусы...

### Студзеньскія заваёвы

Прапануем версію „Нівы” лепшых беларускіх спартоўцаў мінулага месяца. За аснову ўзяты выступы на міжнародных спаборніцтвах, дзе і выяўляецца сапраўдны ровень і клас. Называем лепшых беларускіх спартоўцаў мужчын і жанчын.

***Мужчыны***

**1. Уладзімір Самсонаў** (настольны тэніс). Маэстра малой ракеткі спярша дзвюма перамогамі над венгерскімі супернікамі вывеў зборную Беларусі ў фінал чэмпіянату Еўропы 2005 года, а пасля выйграў адкрыты чэмпіянат Харватыі ў адзіночным разрадзе. У Заграбе на шляху да гэтага трыумфу Уладзімір Самсонаў у паўфінале перамог алімпійскага чэмпіёна карэйца Ру Сон Міня, а ў вырашальным паядынку разграміў чэмпіёна свету аўстрыйца Вернера Шлагера. Цікава, што Самсонаў выйграў тытул чэмпіёна Харватыі ўжо чацвёрты раз (да гэтага ў 1998-2000 гг.).

**2. Васіль Кірыенка** (веласпорт, трэк). Прадстаўнік нашай краіны дастаткова сенсацыйна стаў першым на этапе Кубка свету ў англійскім Манчэстэры. Нечаканасць палягала перш усяго ў тым, што Васіль дасягнуў гэтага лакальнага поспеху ў групавай гонцы па ачках (гэты від не ёсць яго асноўнай спецыялізацыяй).

**3. Максім Мірны** (тэніс). Лідэр нашай тэніснай дружыны ў адкрытым чэмпіянаце Аўстраліі няўдала выступіў у адзіночным разрадзе, затое пацвердзіў рэпутацыю аднаго з самых моцных парных тэністаў свету. Разам са шведам Юнасам Б’ёркманам ён дайшоў да паўфіналу ў спаборы параў, а ў міксце дасягнуў аналагічнага поспеху са знакамітай і „неўміручай” Марцінай Наўрацілавай.

**4. Віталь Кутузаў** (футбол). Гулец нацыянальнай зборнай Беларусі, які выступае за генуэзскую „Сампдорыю”, яскрава выявіў сябе ў гульнях італьянскіх турніраў. Спярша ён вызначыўся выніковым стрэлам у кубкавым матчы, а пасля забіў самы хуткі гол (ужо на 20-й секундзе!) у бягучым чэмпіянаце серыі „А”.

**5. Аляксей Грышын** (фрыстайл). Пасля доўгага „застою” наш лятаючы акрабат здолеў узняцца на трэцяе месца на этапе Кубка свету ў Канадзе. Ці пераадолеў бронзавы прызёр апошняй алімпіяды крызіс — пакажа бліжэйшы час.

***Жанчыны***

**1. Анжаліка Кацюга** (канькабежны спорт). Упершыню ў гісторыі беларуская канькабежка стала срэбнай прызёркай чэмпіянату свету ў спрынтэрскім шматбор’і. Да гэтага вышэйшым дасягненнем была бронза першынства планеты. Поспех Кацюгі падаецца найбольш важкім у мінулым месяцы.

**2. Алёна Зубрылава** (біятлон). Адзіная, хто сёлета годна трымае марку айчыннага біятлона, Зубрылава на этапе Кубка свету ў італьянскім Антхольцы выйграла гонку на 15 км. Па суме ўсіх этапаў у гэтай дысцыпліне Алёна ідзе 5-й, а ў агульным заліку ўсіх стартаў займае 6-е месца.

**3. Ала Цупер** (фрыстайл). У амерыканскім Лэйк-Плэсідзе на этапе Кубка свету Цупер „узляцела” на трэцюю прыступку п’едэстала. Можна сказаць, што спакваля нашы фрыстайлісты набіраюць добрую форму.

**4. Вікторыя Паўловіч** (настольны тэніс). 16-я ракетка свету сваімі перамогамі вывела зборную краіны на першае месца ў сваёй адборавай групе і адпаведна ў фінал першынства кантынента. У Харватыі Віка дайшла да 1/8 фіналу.

**Уладзімір Хільмановіч**

# *Занатоўкі кантрабандыста*

### ***Хто „падставіў” Косцю Крываноса***

*Толькі я выйшаў з хаты, як мяне ледзь не збіла машына. Яна невыносна для слыху запішчала тармазамі і спынілася так блізка ад мяне, што падалося чую пульс шафёра. Але вадзіцель не пераймаўся гэтай сітуацыяй. Ён, не звяртаючы аніякай увагі на мой белы ад жаху твар, радасна выскачыў з машыны і лётаў вакол яе як з ланцуга сарваўшыся. Барабаніў рукамі па бензабаку, нагамі па колах, і штосьці, захлынаючыся ад шчасця, тлумачыў. Да мяне паступова сталі вяртацца некуды адляцеўшыя ад страху зрок, слых і душа, і праз некалькі хвілін я мог ужо ўсё чуць і бачыць.*

*Перада мной вакол машыны танцаваў Косцік Крыванос. Ведаў я яго даўно. З таго дня як яго выгналі з міліцыі (з яго слоў за чэснасць), і ён пастанавіў займацца кантрабандай. Гэта быў вельмі вынаходлівы і вельмі эмацыйны хлопец. Усе яго прыдумкі як лепш схаваць кантрабанду суправаджаліся такім выбухам эмоцый, што, здавалася, ён атрымаў стопрацэнтныя гарантыі жыць дзвесце трыццаць два гады і сем месяцаў, увесь гэты час заставацца маладым, а пасля, незалежна ад таго, як жыў, патрапіць у рай. Яго эмацыйны стан заўсёды суправаджаўся бязмежным паглынаннем алкаголю, пры якім Крыванос за свой кошт паіў усіх сяброў. І паспрабуй толькі адмовіцца. Крыўды будзе да наступнага моманту разгулу эмоцый.*

*Увогуле Косцік амаль не ўжываў алкаголю. Ведаў, што гэтае зелле адбівае яму мазгі. Дурны тады рабіўся, як дзіравы бот з левай нагі. Таму злоўжываў беленькай толькі па дзвюх прычынах: калі яго наведае муза вынаходніцтва і калі яго прыдумка церпіць фіяска.*

*— Сёння стаўлю я! — рашуча заявіў Косця. — Мне неверагодна пашанцавала. Купіў я гэтую машыну. „Форд-гранада” называецца. Іх ужо даўно не робяць. Палез глядзець дзе ў ёй можна схаваць кантрабанду... І, о неба! Паглядзі які тут бензабак. Прытыкаецца да задняй сядушкі. Таму на прастукванне ні адзін мытнік не вызначыць што там, бензін ці цыгарэты. Я ўжо перарабіў яго. Два літры бензіну ўлазіць, а рэшту закладаю цыгарэтамі. Ніхто не вызначыць. А зараз збірайся, паедзем адзначым.*

*— Ну то віншую, — адказваю я. — Толькі не трэба пра гэта крычаць. Мала які гад пачуць можа. Падставяць цябе як калодку пад сякеру. Зараз свет такі. Столькі развялося стукачоў-зайздроснікаў, адзіная жыццёвая мэта якіх — нашкодзіць бліжняму.*

*Ды дзе там. Крыванос і слухаць не стаў. Праз гадзіну, шчодра наліваючы ў шклянкі гарэлку, ён апавядаў пра сваё вынаходніцтва ўсёй кантрабанднай супольнасці. А назаўтра, ужо перайшоўшы на чысты спірт, наняў шафёра і паехаў выпрабаваць навінку на практыцы.*

*Гэта была няўдалая спроба. Кантрабанду знайшлі вельмі хутка. Нават не краналіся іншых месцаў. Адразу палезлі ў бензабак. Косцік, у роспачы, у той жа дзень залёг на дно бутэлькі. Кантрабандысты сталі шукаць стукача. Трэба ж даведацца, хто данёс. А то ўсіх выдасць.*

*Першым у спісе падазроных быў шафёр, які вёз Крываноса. Чалавек ён у асяродку кантрабандыстаў новы, невядомы. Іншыя ўжо гадамі праверaныя. Хлопцы доўга не думалі. Злавілі яго на вузкай гродзенскай вулачцы ды начысцілі лыч.*

*— Ах вы, сабакі! — абураўся той, выціраючы разбіты нос. — Як я мог данесці на Косцю, калі ён мой швагер. Родны муж маёй сястры. Вы ў мяне яшчэ зямлю грызці будзеце, жывёлы! Хай толькі Косця са шклянкі выпаўзе. Ён вам усім пакажа. На каленях прабачацца будзеце.*

*Аргумент быў на карысць шафёра. Сапраўды, хто сваяку шкодзіць будзе. Ды і гарачы характар Крываноса быў вядомы. Кантрабандысты на ўсялякі выпадак папрасілі прабачэння адразу і зноў пачалі вылічваць, хто гадзюка. Хутка спіс западозраных перавысіў колькасць самых кантрабандыстаў. Але аніводзін дэдуктыўны метад прыдуманы намі не прыносіў поспеху. Хлопцы сталі не давяраць адзін аднаму. Замкнуліся ў сабе. Кожны кожнага баяўся.*

*— Далей так доўжыцца не можа, — кажа аднаго дня Юзік Сабалеўскі. — Хутка мы сваіх анёлаў-спадарожнікаў падазраваць пачнем. А наша праца патрабуе даверу. Трэба разабрацца, як і што.*

*— А хто супраць! — у адзін голас зараўлі хлопцы. — Толькі як гэта зрабіць. Крыванос папранейшаму купаецца ў гарэлцы, шафёра пакрыўдзілі. У каго спытаеш?*

*— У мытнікаў. Бачыш, двух з той змены не ведаюць як у Гродна даехаць. Давай падвязем. А там, глядзіш, можа што ўнюхаем.*

*Так і зрабілі. У машыне завялі размову. І як бы мала гэта нас цікавіць, але паколькі няма пра што гаварыць, спыталіся пра Крываноса. Мытнікі, як пачулі гэтае прозвішча, амаль са смеху не зайшліся.*

*— Гэта было ў маю змену, — кажа адзін. — Гляджу, спыніўся „Форд-гранада”. А з яго вылазіць такі п’яны і шчаслівы чалавек, нібы ў яго цешча з’ехала далёка і назаўсёды. Падлятае да нас, і кажа, што такое месца знайшоў для кантрабанды — ні адзін мытнік не разгадае. І яшчэ сказаў дзе яно. Мы спярша думалі жартуе. А пасля глядзім, ён не арыентуецца з кім размаўляе. Пайшлі, праверылі, а там сапраўды кантрабанда. І што самае дзіўнае, гэты Крыванос быў „ніякі” — нічога не памятаў. Ні як да нас зайшоў, ні як расказваў пра сховішча ў машыне. Толькі як мы бак знялі, крыху працверазеў ды кажа: „Хто мяне падставіў? Нехта данёс. Бо самі вы нізашто не здагадаліся б”.*

***Сымон Нальшанскі***

Вачыма Міры

# Тры Ганавічнікі



Па-пад лесам, сярод палеткаў, засеяных тымсім альбо і зарастаючых буяючым лабузіннем ды лясным самасеем, стаіць хата трох Ганавічнікаў. Коля, Косцік і Крысцё Назарэзікі — кавалеры, нестарыя. Жыць мусова, так сказаць, як набяжыць. Пакуль жылі маці Маня ды дзед Ваня, неяк жылося, пакуль не пераелі геркаўскія рэнты. Малодшыя крыху чыпелі ў Гайнаўцы, рабілі, пасля падтрымліваў быў іх і Курань сваім славутым „супам”. За абаронцаў простага люду хлопцы, як і ўсе ў вёсцы, паставалі б муром.

— Шкада, што памерлі, а то і сёння мы аддалі б на іх галасы! — кажа Косця і пацягвае проста з рыльца бутэлькі вішнёўку, адзін буталь ледзь за шэсць злотых. Вішнёўка „скляповая”, ведаеш, што п’еш, не тое, што рускі разбаўлены спірт ці Раяль. Ад такога дык толькі што гебнулі два маладыя суседзі. Напіліся ў кампаніі, заснулі дый не паўставалі. Нават іх і не памылі перад пахаваннем, бо не было як; паразгіналі акалеўшых нябожчыкаў, пашукалі чыстых якіх ануч у шафах, і нацягнулі на транты нейкія летнікі ці не па дзеду, паклалі ў труны аплачаныя гміннай сацыяльнай апекай, і адправілі на стары могільнік за вёскай, дзе ў свежых магілах пакоіцца штораз маладзейшыя жыхары навакольных вёсак. О не, Коля, Косцік ды Крысцё да такога не давяліся. У параўнанні з хатай Паўлушыных дык іхняя сядзіба маецца як варшаўскі гатэль „Марыёт” да гміннай абрыганай забягалаўкі. Праўда, начуе ў іх народ, але за сваё ўсе п’юць. І спаць валяцца не на падлогу, а на тапчаны, канапы, ложкі, у пасцель, як людзі. Праўда, напалохаліся тады, пасля скону Паўлушыных хлопцаў, Ганавічнікі, нават не пайшлі развітацца, не то што каб у царкву ды правесці на могільнік. Першы раз, бо хлопцы радзінныя, свойскія — і ніякага вяселля не прапусцяць, і хрысцін, і мярлін. Спачуваюць, цешацца. Чалавек жа ж жывы, сярод людзей жыве.

Прыйшоў быў лось на падворак Ганавічнікаў. Калісьці, у лютыя зімы, жывёлы шмат наведвалася на падворкі, пад адрыны ды стагі, каб пакарміцца. Цяпер тыя зімы як не зімы. Чаго ласю было завітваць на падворак галодных гаспадароў? Можа, звабіла яго мычанне апошняй каровы ў напаўразваленай аборы? Зацяўкалі тры сабакі, накінуліся на звяра, загналі яго паміж шопкі. Схапіў Крысцё сякеру, Косцік нейкі лом... Загналі лася ў недапалены садок, запутаўся паміж галінамі старых яблынь. Мелі хлопцы мяса шмат, сабакі касцей. Скуру звалілі ў нужнік. Мусілі да ветру хадзіць за стадолу, бо тая акалелая ласёва скура тырчала з ямы над седала. Пакуль мароз трымаў, дык стаяла там дыба, не псавалася. А пасля і дастаць яе цяжка было, як пацяплела. І калі сталі стражнікі па вёсцы шукаць рыбалоўных сетак, нарваліся на той смярдзючы срач з хмарай мух. Пашукалі ў Ганавічнікаў больш дакладна — а тут у іх на гарышчы наступнае: абрэзы, пісталеты, стрэльбы-двухстволкі, набор спецназаўскіх нажоў... Калекцыянеры! — казалі. Нідзе таго ўсяго не ўжывалі. Мужчынская справа збіраць ружжо. Займаліся гэтым пушчанскія людзі здавён і заўсёды. Віну на сябе ўзяў найстарэйшы, Коля.

— То хоць у цяпле пажыве, — каменціруе Крысцё. — Добра накормяць. Тэлевізар е, камп’ютэр. Чалавек у турме развіваецца. Адно толькі, што няма як напіцца. То хоць будзе мець дармны „адвык”. А што бабаў няма... А што, тут можа іх маем?..

**Міра Лукша**

# Яшчэ пра назвы

Год мінае, як паслаў я ў „Ніву” матэрыял „Скуоль чыжувські патрыётызм”, і... год мінае, як ляжыць ён пад забаронай друкавання. Быццам нейкія крамольныя думкі я хачу ў ім выявіць, якія могуць стаць газеце ці чытачам небяспечнымі. Ды праз гэта адчуваю сябе быццам падцэнзурнага перыяду пісмач, які мае аднак свой гонар і на ніякія ўступкі не ідзе. Добра, што хаця ведаю прычыну цэнзуры — гэта мова. Так, менавіта маёй роднай мове, таксама беларускай мове, старажытнай і шляхетнай, не даецца месца ў газеце. А „Ніва” ж узгадавала мой беларускі патрыятызм, навучыла агульнанацыянальнай мовы, ды дала зразумець, што трэба моцна трымацца сваіх каранёў. А галоўныя з іх — гэта жывая памяць продкаў ды культываванне іх мовы. Што значыць культываванне? Гэта не толькі вусныя выказванні сваіх думак да родных, блізкіх, знаёмых; гэта таксама дасканаленне мовы, адукацыя на ёй дзяцей ды пераказванне яе ў пісьмовым запісе шырэйшай агульнасці. У іншым выпадку мова здадзеная на абмярцвенне.

Не буду аднак далей выліваць свайго жалю, я ж не жанчына. Мэта майго допісу гэта, перш за ўсё, падтрымка думак спадара Васіля Сакоўскага („Ніва” н-р 4 ад 23 студзеня 2005 г.) наконт правілаў беларускага запісу назваў мясцовасцей, мікратапанімаў ды прозвішчаў на тэрыторыі Падляшша. Поўнасцю згаджаюся з думкай аўтара, што ў нашых умовах усё гэта павінна быць на старонках „Нівы” і іншых беларускамоўных выданняў запісванае згодна з арыгінальнай вымовай. Гэта тычыцца перш за ўсё тэрыторый Бельскага, Гайнаўскага і Сямятыцкага паветаў, дзе мова беларусаў у агульнасці іншая, чым тых з Беластоцкага ці Сакольскага. А ў гэтых першых пражывае найбольш свядомых беларусаў ды перш за ўсё на іх патэнцыяле трымаецца беларуская нацыя ў Польшчы. І яны, беларусы Бельшчыны, Гайнаўшчыны, Семятыччыны маюць паўнацэннае права ўжываць сваю мову, рускую мову ў беларускіх медыях ды адукацыі.

Са згаданага матэрыялу спадара Сакоўскага надумалася мне яшчэ адна справа — а як будуць запісваны на табліцах, бо ўжо тэарэтычна могуць, беларускія назвы мясцовасцей у Бельскай, Гайнаўскай, Чыжоўскай, Арлянскай, Дубіцкай ды іншых гмінах? Я асабіста не ўяўляю сабе іншай магчымасці, як запіс у арыгінальнай, мясцовай вымове. Дам некалькі прыкладаў: Дубічы-Цэркоўны (не Царкоўныя), Тофыловці (не Тафілаўцы), Крывятычы (не Крывяцічы), Голоды (не Галады), Парцево (не Парцава), Суховульці (не Сухавольцы), Рыгорувці (не Рыгораўцы), Старэ Бэрэзово (не Старое Беразова). Згоднасць з арыгінальнай вымовай мясцовасцей можна праверыць у капітальнай працы праф. Міхала Кандрацюка „Nazwy miejscowe południowo-wschodniej Białostocczyzny”.

Калі б пайшлі мы па прынцыпу падцягвання арыгінальных назваў пад сённяшнюю прынятую літаратурную норму беларускай мовы, паступілі б як чарговыя фальсіфікатары. Для ўрадавых назваў гэты прынцып будзе відавочна вырашацца на найвышэйшых узроўнях. Але ўжо цяпер беларуская падляшская інтэлігенцыя, каб не быць нямым сведкам новай фальсіфікацыі назоваў, павінна звярнуць на гэтую тэму ўвагу дысідэнтаў, яд якіх залежыць увядзенне ў жыццё закону аб нацыянальных меншасцях.

**Дарафей Фіёнік**
**(Бельск-Падляшскі)**

**Ад рэдактара**: Як слушна заўважыў Дарафей Фіёнік, „Ніва” з’яўляецца агульнанацыянальнай газетай ужо амаль 50 гадоў. Жадаем Вам поспехаў у працы на карысць нашай супольнай беларускай справы. Чакаем Вашых допісаў.

**Чаму польскія спецыялісты рашыліся эміграваць, расстацца з сям’ёй ды айчынай? Вынікі апытанняў сярод эмігрантаў паказалі, што прычынай былі высокія заробкі і спрыяльныя ўмовы для рэалізацыі прафесійных намераў...**

# Еўрапейцы

Дзевяць месяцаў ужо мы з’яўляемся членамі ЕС. Зараз стаім напярэдадні рэферэндуму ў справе ратыфікацыі Еўрасаюзнай канстытуцыі. Такую волю прад’явілі палітыкі правага боку парламента (у асноўным Ліга польскіх сем’яў, Самаабарона і ПіС). Які атрымаецца вынік — цяжка адказаць. Хоць большасць суайчыннікаў (у час уступлення) стала на баку сімпатыкаў ЕС, дык многія хісталіся. Зараз неабходная грамадская адукацыя. Бачыўшы такую патрэбу, публічнае тэлебачанне падрыхтавала цыклічную перадачу „Еўрапейцы”, у якой будзе знаёміць тэлегледачоў з праблемамі ЕС. Першы рэпартаж наконт рынку працы быў паказаны 24 студзеня. Сем чарговых будзе тычыцца іншых спраў. Затым будзе падведзены падлік аргументаў „за” і „супраць”. У дыскусіі ўдзельнічалі журналісты, сацыёлаг, прадстаўнікі прадпрымальнікаў малой і сярэдняй вытворчасці, як і прафсаюзнай арганізацыі „Салідарнасць”. Пытанне зводзілася да адной тэмы: ці палякі будуць мець свабодны доступ да рынку працы і чаму рашаюцца на эміграцыю?

Як вядома, большасць дзяржаў ЕС абмежавала свабодны доступ на рынку працы для чужаземцаў. Адна толькі Вялікабрытанія аказала шчодрасць ды прад’явіла аж трынаццаць тысяч месц працы. Высокія зарплаты манілі многіх палякаў, але перашкодай з’явілася мова. Першыя паехалі студэнты, якія вывучалі англійскую мову. Гэтыя прымалі пасады афіцыянтаў у рэстаранах. Затым былі шафёры. Англічане бачылі ў палякаў добрасумленных і дысцыплінаваных працаўнікоў. Таму пахадайнічалі, каб гэтыя заняліся вярбоўкай новых кандыдатаў. Апрача атракцыйнай платы, фірмы абавязаліся ў дапамозе знайсці працу жонцы новага працаўніка ці сацыяльнай кватэры, паколькі з гэтым вялікая праблема. Калі знаходзілася большая група кандыдатаў, дык пасылаўся аўтамабіль у Польшчу, каб аблегчыць гэтым у коштах падарожжа. Зараз Францыя з Італіяй задумоўваюцца ці не пакарыстацца прыкладам англічан, хоць пачаткова выказваліся супраць. Рынак працы ў айчыне аказаўся ўніжальным для медработнікаў. Таму лекары і медсёстры падаліся за працай у Скандынавію. Чаму польскія спецыялісты рашыліся эміграваць, расстацца з сям’ёй ды айчынай? Вынікі апытанняў сярод эмігрантаў паказалі, што прычынай былі высокія заробкі і спрыяльныя ўмовы для рэалізацыі прафесійных намераў. Гэта тычыцца ў асноўным маладых лекараў, якім у айчыне абмяжоўваецца магчымасць рабіць спецыялізацыю. Канстатуючы вышэйсказанае ўдзельнікі еўрасаюзнай дыскусіі дайшлі да высновы, што нашае з’яднанне з ЕС дае магчымасць свабодна падарожнічаць па Еўропе ды рэалізаваць намеры, што ў сучаснай рэчаіснасці Польшчы становіцца немагчымым.

**Уладзімір Сідарук**

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

**Nakład**: 1 964 egz.
**Выдавец**: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва”.
**Старшыня**: Яўген Вапа.
**Адрас рэдакцыі:** 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
**Тэл./факс:** (+48 85) 743 50 22.
**Internet**: *http://niva.iig.pl/*
**E-mail**: *redakcja@niva.iig.pl*

*Zrealizowano przy pomocy finansowej Ministerstwa Kultury.*
**Галоўны рэдактар:** Яўген Вапа.
**Намеснік гал. рэдактара:** Віталь Луба.
**Сакратар рэд.:** Аляксандр Максімюк.
**Рэдактар „Зоркі”:** Ганна Кандрацюк-Свярубская.
**Публіцысты:** Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Ада Чачуга, Паўліна Шафран-Асташэвіч.

**Канцылярыя:** Галіна Рамашка.
**Камп’ютэрны набор:** Яўгенія Палоцкая, Марыя Федарук.
**Друкарня**: „Orthdruk”, Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
**Prenumerata:** 1. Termin wpłat na prenumeratę na II kwartał 2005 r. upływa 5 marca 2005 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch” na terenie całego kraju.

2. Cena prenumeraty na II kwartał 2005 r. wynosi 26,00 zł.

3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 120,00; pocztą lotniczą Europa — 133,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 147,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH” S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 68124010531111000004430494.

4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,45 zł, a kwartalnie — 44,85 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 4,70 (kwartalnie — 61,10), pocztą priorytetową: Europa — 5,90 (76,70), Ameryka Płn., Afryka — 6,60 (85,80), Ameryka Płd., Środk., Azja — 7,40 (96,20), Australia — 9,60 (124,80). Wpłaty przyjmuje Rada Programowa Tygodnika „Niwa”, Białystok, ul. Zamenhofa 27, nr konta BPH PBK SA Oddział w Białymstoku 77 1060 0076 0000 4011 5001 5504.

# На адным вугле хата не ўстоіць

Ужо даўно адзін разумны чалавек сказаў мне: „Коля, шануй і любі сваю жонку, бо жонка — гэта найбольшы скарб!" І гэта праўда, бо нават колішняя пагаворка кажа: „Жонка трымае тры вуглы хаты, а муж толькі адзін". І гэта таксама праўда, бо шмат хто з нас або сам перажыў, або на іншым прыкладзе пра гэта пераканаўся, як распадаліся гаспадаркі, калі не стала жонкі.

Помню, як калісьці ў адной вёсцы гаспадарылі маладыя людзі. Муж любіў выпіць, але жонка была руплівая і гаспадарная і ўсё — каровы, свінні, куры, конь — былі дагледжаны. Але адной ночы яна раптоўна памерла. І з таго часу іх гаспадарка стала падаць. Муж скора распрадаў жывёлу, прадаў і вялікую клуню, ад якой „на памяць" астаўся толькі адзін бетонны слуп, якога не змаглі вырваць з зямлі. І ўсе грошы, што ўзяў за тую клуню, праз тыдзень распусціў, бо дзень і ноч у ягонай хаце было зборышча п'яніц, якія і прапілі той немалы капітал. Калі гаспадар прапіў усе грошы, а піць надалей хацелася, ён адночы пайшоў да сваіх адначарачнікаў, якія ў той час пілі ў іншай хаце. Яны яго „шчодра" пачаставалі, бо ўзялі за рукавы і выкінулі на двор як сабаку. Яны хутка забылі, што яшчэ нядаўна не вылазілі з ягонай хаты, прапіваючы яго грошы. Аднак ён, п'яніца, скора забыў гэтую ганьбу і зноў далучыўся да іх, растатурыўшы ўсю сваю маёмасць, не даўшы дзецям ні залатоўкі, хаця ім нясоладка вядзецца.

А ўсё гэта сталася так таму, што не стала жонкі, бо калі б памёр ён, дык яна неяк спраўлялася б з гаспадаркай. А так атрымалася бяздолле з прычыны мужа — п'яніцы і гультая. Бо добрая, гаспадарная жонка трымае тры вуглы хаты, а муж толькі адно. А ведаем, што на адным вугле хата не ўстоіць, толькі праваліцца. Таму нам, мужыкам, без жонкі — хана.

**Мікалай Панфілюк**
**Дубічы-Царкоўныя**

## Паведамленне

*У сувязі з набліжэннем канца паўнамоцтваў дзеючых улад Беларускага аб'яднання студэнтаў паведамляем аб тэрміне Агульнага сходу сяброў нашай арганізацыі, у ходзе якога будуць падведзены вынікі працы і выбраны новыя ўлады аб'яднання. Сяброў БАСу просім абавязкова з'явіцца на сход. Запрашаем таксама зацікаўленых нашай дзейнасцю, паколькі сход будзе адкрыты для ўсіх.*

*Агульны сход БАС адбудзецца 11 лютага 2005 года (пятніца) у 14 гадз. у зале № 48 галоўнага будынка Універсітэта ў Беластоку (Пляц Універсітэцкі, 1).*

***Ілона Карпюк, старшыня БАС***

## Канцэрт барда Віктара Шалкевіча

*12 лютага г.г. у 15 гадзін Музей і асяродак беларускай культуры ў Гайнаўцы па вул. 3 Мая, 42, запрашае на канцэрт Віктара Шалкевіча. Адбудзецца ён у кіназале музея.*

***(мох)***

*З гісторыі беларускага нацыяналістычнага руху на Беласточчыне*

# A czto eto takoje..?



# ... eto Pan Naczelnik, pan Wójt, Pan..., Panta Rhei...

Według spisu powszechnego Dubicze to po Czyżach druga gmina na Podlasiu o największej liczbie mieszkańców narodowości białoruskiej — 83 proc. **Wójt formalnie jednak zastrzega, że dużo osób przyznaje się do korzeni ukraińskich.**

A teraz raptem co? Prezydent podpisze ustawę i ludzie zaczną pisać nam tu po białorusku? No, chyba że ktoś zechce sprawdzić, jak gmina realizuje wprowadzenie ustawy w życie. — Ale jak mu odpowiemy urzędowo po białorusku, to przyjdzie i będzie pytał „A czto eto takoje?"

А фармальна на якой аснове так сабе агаворваецца? Так сабе абвяргае вынікі **дзяржаўнага** перапісу і волю насельніцтва? **Фармальна** то ў вас там 32 украінцы — можа і шмат. Беларусаў — няшмат, бо толькі 1677.

А чаму ж мелі б не напісаць, калі **дзяржаўны** закон ім на гэта дазваляе? Хіба, што пан войт так сабе будзе супрацiўляцца **дзяржаўнаму** закону, які ўжо падпісаў прэзідэнт.

Пад Масквою можа і запыталі б „А что это такое". 23 гады нажывання на Дубіцкай гміне і не вывучыць мовы 83 прац. насельніцтва? Сорам, пан войт.

# Адгаданка

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 |
| 11 | 12 | 13 | 14 | 15 | 16 | 17 | 18 | 19 | 20 |
| 21 | 22 | 23 | 24 | 25 | 26 | 27 | 28 | 29 | 30 |
| 31 | 32 | 33 | 34 | 35 | 36 | 37 | 38 | 39 | 40 |
| 41 | | | | | | | | | |

## Шыфраграма

Літары адгаданых слоў, перанесеныя згодна з іх парадкавымі нумарамі ў клеткі роспісу, складуць рашэнне — народную прыкмету.

1. падзея, справа, частка тэатральнай пастаноўкі = 37 _ 9 _ 8 _ 1 _;
2. палац і крэпасць феадала = 3 _ 41 _ 4 _ 5 _ 2 _;
3. у роце, граблях, баране = 26 _ 38 _ 7 _;
4. сістэма ўмоўных абазначэнняў, сігналаў, якія перадаюць інфармацыю = 28 _ 29 _ 30 _;
5. над зямлёю = 32 _ 33 _ 24 _ 23 _;
6. адзінка электрычнага супраціўлення = 13 _ 10 _;
7. памяшканне паміж жылой часткай дома і ганкам у вясковых хатах = 21 _ 30 _ 22 _ 4 _;
8. важная фігура не толькі ў картах = 16 _ 15 _ 14 _;
9. сасок у млекакормячых жывёл = 40 _ 31 _ 39 _ 18 _ 17 _;
10. шкло, устаўленае ў аконную раму = 27 _ 36 _ 35 _ 34 _;
11. белы клён, песенны партнёр каліны = 20 _ 19 _ 11 _ 12 _; **(ш)**

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

**Адказ на адгаданку з 51 нумара**

Агонь, аўчына, Быкаў, воз, дзіця, дзюна, Ева, жменя, зіма, заяц, Ленін, Лука, сені, удаў, хаос, цыцка, яд, Якаў.

Рашэнне: **Калі дзяўчына выходзіць замуж, мяняе зацікаўленне ў дзесяці юнакоў на абыякавасць у аднаго.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Мікалаю Лук'янюку** з Бялкоў і **Лявону Федаруку** з Рыбалаў.

# 06.02 – 12.02

**Баран (21.03. — 19.04.)** Набліжаецца знакаміты час зрабіць кар'еру. Закруціся каля кагосьці, каго адкінулі ці пакінулі. Можаш планаваць якуюсь больш адважную інвестыцыю.

**Бык (20.04. — 20.05.)** Мала табе будзе поспехаў і грошай, захочаш славы! Любоўныя непаразуменні могуць давесці да расстання. Пільнуй сваіх інтарэсаў. Думай пазітыўна.

**Блізняты (21.05. — 21.06.)** Можаш бліснуць інтэлігентнасцю, размоўнасцю, досціпам. 11-12.02. вырашыш складаныя справы. 6-10.02. можаш ачараваць усіх, але і цябе могуць звесці. Марс значна падыме тэмпературу пачуццяў.

**Рак (22.06. — 22.07.)** Зважай на грошы! Лёгка іх здабудзеш, але і хутка можаш страціць. Калі зробіш памылку, асабліва сям'я можа не даць табе другога шанцу. Не пераймайся крытычнымі заўвагамі, не паддавайся маразму і знеахвочанню (маеш шанц на поспех на працы і ў фінансах).

**Леў (23.07. — 22.08.)** Фартуна мае намер шырока да цябе ўсміхнуцца. Да 9.02. ты асаблівы шчаслівчык. Пасля 10.02. будзеш пільным, спрытным, уважлівым; варта паафармляць важныя справы. Можаш сам на сябе сцягнуць клопаты 6-10.02.

**Дзева (23.08. — 22.09.)** 8-12.02. можаш паказаць свае веды, асабліва сярод новых знаёмых і ў падарожжах. Калі хочаш здаць экзамен на вадзіцельскія правы, не рабі гэтага 6-10.02. Пасля 9.02. — недахоп даверу да ўласнай інтуіцыі, адцінанне ад уласных пачуццяў. У каханні падвойнае шчасце, што б гэта ні значыла.

**Шалі (23.09. — 23.10.)** Фартуна надта ж ласкавая. Грошы, якія можаш зарабіць, добра заінвестуеш. Гэта можа быць вялікая любоўная прыгода, альбо толькі хвіліна забыцця. Можаш мець праблемы з вернасцю.

**Скарпіён (24.10. — 21.11.)** Маеш шанц рэалізаваць найбольш смелыя прафесійныя праекты. Можа паявіцца хтосьці, каго чакаеш усё жыццё. З 10.02. надта ж многа энергіі. Не накідай іншым сваіх ідэй (9-12.02.), бо можаш нарабіць сабе ворагаў.

**Стралец (22.11. — 21.12.)** Не пераймайся! Можаш знайсці дадатковую крыніцу падзарабіць. Да 9.02. вялікая прыхільнасць атачэння; варта паафармляць юрыдычныя справы. Многа жарсці, яшчэ больш чуласці.

**Казярог (22.12. — 20.01.)** 6.02. узрастуць твае амбіцыі і прадпрымальнасць. Шмат можаш здабыць як у прафесійным жыцці, так і прыватна. З 11.02. — перашкоды ў планах, непрыемнасці, нават нейкае прыніжэнне. Калі паверыш, што сядзіш на жыле золата, знойдзеш яго!

**Вадалей (21.01. — 19.02.)** Не азірайся на нішто, сам бярыся за свае інтарэсы. Неўзабаве ў сэрцы выбухне май! Не раздзірай старых ран.

**Рыбы (20.02. — 20.03.)** Да 10.02. справішся з „хвастамі". 11-12.02. можаш ляпнуць штосьці сабе на шкоду. Будзь разважлівы ў краме. На працы падцягнеш справы і знойдзеш саюзніка. Твае апаратыўнасць і спрыт прынясуць шчасце ў фінансах.

**Агата Арлянская**

ISSN 0546-1960